беларуская газэта. Заснаваная ў 1906 г. у Вільні. Адноўленая тамсама ў 1991 г. як штомесячнік. З 1 сакавіка 1996 г. выходзіць у Менску штотыднёва

# НАША НІВА

№ 34 (72)
25 лістапада
1996 г.

выходзіць у панядзелкі

**ТЭЛЕПРАГРАМА**
**20 MTV**
5 Навіны на кінарынку.
**ІНСТРУКТАР**
6 Як зрабіць труну.
**СПАЖЫВЕЦ**
7 Набываем фатастужку.
**ШУФЛЯДА**
10 Беларускі непадцэнзурны друк.
**РОЗНАЕ**
12 Тэст: Ці добры Вы выхавальнік.

Мечыслаў Грыб:

# «Я не сумняваюся, што вынікі рэфэрэндуму ўжо сфальсыфікаваныя»



*Учора карэспандэнт «Нашай Нівы» размаўляў з экс-сьпікерам Вярхоўнага Савету дэпутатам Мечыславам Грыбам.*

**«НН»: Спадар Мечыслаў, у мінулую суботу ў інтэрвію расейскай службе радыё «Свабода» Вы сказалі, што валодаеце інфармацыяй пра тое, што прэзыдэнт Лукашэнка пастаўлены Масквою...**

**М.Г.:** Гэта інфармацыя, атрыманая ў размове з уплывовым расейскім палітыкам. Ягонае імя я пакуль не хачу называць.

**«НН»: Ваш прагноз наконт рэакцыі Масквы на сёньняшнія падзеі ў Беларусі.**

**М.Г.:** Я думаю, што Масква ня будзе рэагаваць нейкім асаблівым чынам. У пэўнай ступені яе задавальняе сёньняшні стан палітыкі ў Беларусі. Не зьяўляецца вялікім сакрэтам тое, што сёньня Масква ня бачыць у Беларусі іншага чалавека, які б быў такім вялікім прыхільнікам аб'яднаньня з Расеяй.

**«НН»: Як Вы ацэньваеце ролю ядравай зброі ў прыезьдзе расейскай урадавай дэлегацыі ў Беларусь. Ёсьць інфармацыя, пацьверджаная расейскім Генштабам, што васямнаццаць ядравых ракетаў пакінулі тэрыторыю Беларусі праз некалькі гадзінаў па прыезьдзе ў Менск Віктара Чарнамырдзіна.**

**М.Г.:** Я мяркую, што ракеты мелі да гэтага дачыненьне, і не малое. Гэта расейская зброя, і мы павінны вярнуць яе гаспадарам. Але ў мяне ёсьць сумнеў, што ядравая зброя магла быць перавезеная так хутка. Транспартыроўка такіх рэчаў —вельмі складаны тэхналягічны працэс. Зь іншага боку, дагэтуль мы ня мелі падставаў ня верыць інфармацыі расейскага Генштабу. Каб гэта казалі нашы, я б, зразумела, не паверыў. Але чаму нашы кажуць, што чатырнаццаць ракетаў застаюцца ў Беларусі?

**«НН»: Спадар Мечыслаў, Ваш прагноз на бліжэйшыя дні.**

**М.Г.:** Я лічу, што Сямёна Шарэцкага прымусілі падпісаць пагадненьне кіраўнікоў трох галінаў улады, паводле якога новая канстытуцыя прымаецца на канстытуцыйным сходзе. Рэч у тым, што гэта супярэчыць дзейнай Канстытуцыі, паводле якой Канстытуцыя Рэспублікі Беларусі прымаецца Вярхоўным Саветам. Таму ня маюць права ні старшыня ВС, ні прэзыдэнт, ні, тым больш, старшыня Канстутыцыйнага Суда, падпісваць нейкія дакумэнты, якія патрабуюць зьменаў у нашай Канстытуцыі.

**«НН»: Як Вы лічыце, ці ёсьць верагоднасьць разгону Парлямэнту?**

**М.Г.:** Цалкам верагодна. Я не сумняваюся, што вынікі рэфэрэндуму ўжо сфальсыфікаваныя: падробкі бюлетэняў гатовыя, лічбы галасоў вызначаныя. Таму Лукашэнка зможа заявіць, што паводле ягонай новай канстытуцыі цяперашні парлямэнт не дзеяздольны.

**«НН»: Вы вярнуліся з Паўночна-Атлянтычнай Асамблеі. Як там ставяцца да нашых падзеяў?**

**М.Г.:** Ставяцца вельмі проста й адназначна. Там працуюць прыхільнікі дэмакратыі й абароны правоў чалавека: 16 пастаянных членаў, 16 асацыяваных, і восем наглядальнікаў. Нашае пытаньне вынесьлі на разгляд. Прынялі рэзалюцыю.

**«НН»: Якім будзе ўплыў савецкай грамадзкасьці на Расею ў зьвязку зь ейнай палітыкай ў Беларусі?**

**М.Г.:** Я думаю, будзе вельмі моцны ціск. Але што зробіць Расея — цяжка сказаць. Калі б Расея, як іншы цывілізаваны сьвет, не прызнала вынікаў гэтага рэфэрэндуму, было б добра. Але хутчэй за ўсё яна адасобіцца.

**«НН»: Як паўплывае на сытуацыю ў краіне тое, што гэты рэфэрэндум — незаконны?**

**М.Г.:** Нехта з гэтым пагодзіцца, складзе свае крылы, нехта будзе адстойваць свае погляды — значна больш радыкальным чынам. Бо тое, як усё гэта робіцца — гэта зьнявага над народам.

ІНТЭРВІЮ ЎЗЯЎ АЛЕГ ДАШКЕВІЧ



Здымак Уладзіміра Шлапака

## Студэнты свой выбар зрабілі

22 лістапада на ўказку дэканата старасты груп сагналі студэнтаў 2-га курсу гістфаку БДУ на палітінфармацыю. Выкладчык з факультэту міжнародных зносінаў, якому даручылі «прасьвятліць» студэнтаў у пытаньнях рэфэрэндуму, пачаў ужо было казаць пра важнасьць выбару, які тэба зрабіць на дадзеным гістарычным этапе. «А мы свой выбар зрабілі!» — раптам раздалося з «камчаткі». Аратар апешыў. А ў наступную хвіліну аўдыторыя абрушыла на яго лавіну рэплік, самая мяккая зь якіх была:»А колькі табе заплацілі?!» Дыскусія скончылася тым, што усе студэнты дэманстратыўна ўсталі і пакінулі залю.

Л.У.

## Інфарматар

Замежжа

### Два тыдні ў Нарвэгіі

Карэспандэнт «НН» Таіса Бандарэнка два тыдні правяла ў Нарвэскім інстытуце журналістыкі, які знаходзіцца ў невялічкім гарадку Фрэдрыкштаце, 100 км на поўдзень ад Осла. Яе назіраньні і параўнаньні зь беларускімі рэаліямі склаліся ў рэпартаж «Доўгі шлях да самасьвядомасьці», які друкуецца на 4-й старонцы.

Гісторыя

### Археалягічнае лета:

*пошукі, адкрыцьці, сэнсацыі*

Кожны археалягічны сэзон прыносіць вялікую колькасьць зыходнага матэрыялу для напружанай аналітычнай працы, у выніку якой і паўстае перад намі імглісты вобраз мінуўшчыны. Што шукалі і што знайшлі беларускія археолягі гэтым летам? Пра гэта — у артыкуле Міколы Крывальцэвіча на старонцы 13.

Літаратура

### ПОСТМАДЭРНІЗМ

Слоўнік асноўных тэрмінаў постмадэрнізму, складзены амэрыканцам Брадам Холандам для часопіса The Atlantic Monthly і знойдзены на Інтэрнэце Уладзімерам Баранічом, друкуецца на старонках 14-15.

Конкурс

### Краіна замкаў

Ініцыятарам новага конкурсу «Нашай Нівы» стаў Клюб грамадзянаў Вялікага Княства. Прысьвечаны конкурс старажытным замкам, прыз — падарожжа ў Вільню. Першае заданьне друкуецца, як заўсёды, на старонцы 16. Тамсама падводзяцца вынікі папярэдняга конкурсу, які называўся «Крывіцкая Мэкка».




# Чатыры радкі

*Сёньня ў Віцебску пачынаецца суд над Славамірам Адамовічам*

Сьвежая навіна зь нясьвежым прысмакам... Адвакат Адамовіча сп. Паганяйла атрымаў гэтае паведамленьне пасярод мінулага тыдня зьнянацку. Сёньня сп. Паганяйла мусіць прысутнічаць у Гомельскім абласным судзе, дзе йдзе працэс па сэрыйных забойствах у Сьветлагорску, і гэтага не маглі ня ведаць у Генэральнай пракуратуры Беларусі. Таму судовы працэс С.Адамовіча пачнецца ў адсутнасьці адваката.

Момант для працэсу быў абраны таксама трапна — у разгар пасьлярэфэрэндумных дэбатаў, з разьлікам на тое, што суд над паэтам патоне ў бурапене папулісцкай дэмагогіі, і пра лёс Адамовіча мала хто дазнаецца. Сьпешка відавочная, бо пасьля дзевяці месяцаў трыманьня паэта за кратамі, абвінаваўчы бок так і не пасьпеў сфабрыкаваць хоць якую літаратурную экспэртызу. Між тым, сп. Паганяйла ўжо накіраваў ліст у Віцебскі суд з чарговай просьбаю вызваліць Адамовіча з-пад варты, матывуючы бяссэнсавасьць такога жорсткага абыходжаньня з хворым чалавекам перад пачаткам судовага працэсу, адтэрмінаваць паседжаньне на тыдзень на падставе недаведзенасьці віны і адсутнасьці літэкспэртызы, тэрмінова даць літаратуразнаўчае заключэньне па вершы «Убей президента!», за які паэта і судзяць...

Аднак улады па-ранейшаму робяць выгляд, што Адамовіч — вязень зусім не палітычны. Хоць, як высьвятляецца, «вярхі» добра інфармаваныя наконт ягонага лёсу. Калі дэпутат Вярхоўнага Савету сп. Знавец 21 лістапада зьвярнуўся з публічным запытам да Ерына, намесьніка старшыні КГБ, той заявіў, што галоўны зьмест злачынства Адамовіча — парушэньне падпіскі пра нявыезд. Сьцьверджаньне Ерына наперад хлусьлівае — Адамовічу дазволілі ў красавіку зьездзіць да бацькоў у Мядзельскі раён...

Спадзеву на справядлівы суд пры гэтым рэжыме няма. Людзі, якія кіруюць пры дапамозе хлусьні і жорсткасьці, не зацікаўленыя ў законнасьці. Адзіны спосаб рэальна паўплываць на ходу працэсу залежыць ад кожнага, хто чытае цяпер гэтыя радкі! Напішыце ліст з патрабаваньнем даць Адамовічу свабоду на імя Генэральнага пракурора Беларусі. Можа быць, гэта апошні шанец...

Упартасьць людзей, якія прагнуць пазбавіць паэта свабоды любымі сродкамі, ужо даўно пераходзіць межы чалавечнасьці. На мінулым тыдні маці Славаміра наведвала яго ў віцебскай турме. Адамовіч спрабаваў перадаць ёй свой верш, але ахоўнікі груба перарвалі сустрэчу, выхапіўшы рукапіс зь ягоных рук. У выніку да нас дайшла толькі першая страфа:

*Канчаецца лета, яблычны Спас*
*пра Афрыку мараць птушкі.*
*Ах, як на волі прыгожа ў Вас.*
*Ах, як за кратамі скрушна...*

СЯРГЕЙ ХАРЭЎСКІ

# Гістарычнае і лягічнае

Адчуваньне нерэальнасьці сёньняшняе гісторыі Беларусі ўзмацняе тэкставы падыход да навакольнага сьвету, бо чалавек, які выхаваны на кніжнай культуры, імкнецца ўсё, перажытае ім, пакласьці ў гістарычны тэкст, а часам, праз сваю памяць, і перачытаць гэты тэкст. Падвоенасьць паміж гістарычным і лягічным ператварае тэкст сучаснае гісторыі Беларусі ў набор фрагмэнтаў, якія цяжка зьвязаць паміж сабою лягічна. Тэкст і чытаньне робяцца захапляльнымі там і тады, дзе ўтвараецца шчыліна паміж рознымі парадкамі сьвету — рэальным і ідэальным, паўсядзённым і пазачасавым.

Гістарычнае выяўляе структурныя працэсы ўзьнікненьня й фармаваньня аб'екта. Лягічнае асэнсоўвае тыя суадносіны, сувязі і ўзаемадзеньні, якія існуюць у разьвітым стане аб'екта. Ад сучаснай беларускай сытуацыі нацыянальная сьвядомасьць патрабуе менавіта лягічнага стану. Гістарычнае ж суадносіцца зь лягічным як працэс разьвіцьця суадносіцца зь ягонымі вынікамі. Хоць адзінства гістарычнага й лягічнага мае выключнае значэньне для разуменьня сувязі паміж гісторыяй аб'екта ды ягонай разьвітай формай, яны супадаюць толькі ў агульным і цэлым, бо ў аб'екце, які дасягнуў клясычнай формы, адпадае й страчваецца ўсё выпадковае, усе зыгзагі разьвіцьця, якія непазьбежныя ў рэальных працэсах. Але менавіта таму, што ў самой рэчаіснасьці працэс і вынік разьвіцьця не супадаюць, хоць і знаходзяцца ва ўзаемасувязі, непазьбежна ўзьнікае розьніца ў зьмесьце гістарычнага й лягічнага спосабаў асэнсаваньня рэчаіснасьці.

У такой «вечна» незавершанай сытуацыі пазбаўленьня гістарычнага тэксту лягічнай завершанасьці адбываецца дэсакралізацыя гэтага тэксту — і прама прапарцыйна ўзрастае адказнасьць чытача. Ад яго патрабуецца ўнівэрсальнасьць ахопу «ўласнага» гістарычнага матэрыялу пры нелінейнасьці яго выкладу. Сучасная гісторыя выступае тут як бясконцая зьмена інтанацыяў пры «паўторах».

Можна паспрабаваць знайсьці свой утульны прытулак у прагназаваньні. Але футуралягічныя прароцтвы немагчымыя ўжо таму, што гістарычнае разьвіцьцё залежыць галоўным чынам ад росту ведаў, які не паддаецца прадказаньню. У дачыненьні да сацыяльна-гістарычнага працэсу трэба казаць не пра законы ва ўласным сэнсе слова, а хіба толькі пра «тэндэнцыі». Спроба надаць ім статус гістарычнай заканамернасьці й на гэтай падставе прадказаць будучыню непазьбежна вядуць да сьляпой веры ў аўтарытэты, да аслабленьня крытычнага падыходу, да дагматызму, да скрайніх формаў рэглямэнтацыі чалавечых паводзінаў.

Такім чынам, апраўдана адмоўвіўшыся ад выключна лягічнага, мы нечакана пачынаем адчуваць незадаволенасьць гісторыяй. Нам хочацца тых ведаў пра сьвет, праз якія мы ўжо ня будзем цалкам падуладныя гісторыі. Прарывам адтуль можа стаць усьведамленьне гістарычнасьці нашай экзыстэнцыі, якая робіцца тою кропкаю нашай безумоўнай адказнасьці й выбару свайго месца ў сьвеце, адкуль мы перасякаем час у якасьці гістарычнага. Тут мы ў якасьці гістарычнай экзыстэнцыі выходзім за межы гісторыі. Але й гэты шлях па-за гісторыю ідзе толькі праз гісторыю.

Наша гісторыя — шлях, а ня вынік, праблема, а не адмычка.

**Алег Дзярновіч**

# Паміж Валадаркай і пляцам Незалежнасьці

З 15-га лістапада два антыподы — Валадарка (СІЗО на вул. Валадарскага) і пляц Незалежнасьці — раптам набылі шмат агульных рысаў. І там, і тут — натоўп людзей, у якім нехта чакае волі, а нехта смуткуе з прычыны яе страты. Абодва месцы яднае дачыненьне да «агульнага рэжыму» не з уласнае волі: з тых, хто стаіць на пляцы, наўрад ці нехта калісьці аддаў свой голас за суайчыньніка з прозьвішчам Лукашэнка. І пры пэўным раскладзе картаў пляц можа ператварыцца ў Валадарку —праўдзівей, шлях зь першага пракладзецца да другой. Бо тым, хто сёньня ўваходзіць у катэгорыю «нявверных» у дачыненьні да культу прэзыдэнцкай палітыкі, ужо дадзеная прылюдная парада шукаць сабе ці іншую бацькаўшчыну, ці, крыху перафразуючы, сухую камэру і сухары.

Ранкам 15-га Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусі пакінуў у сіле прысуд Менскага гарадзкога суда для ўкраінцаў — першых палітвязьняў, якіх «ласкава прытуліў» былы Пішчалаўскі замак. Ня буду падрабязна апісваць усе довады, прыведзеныя адвакатамі. Як многія памятаюць, прысуд вынесьлі, абапіраючыся не на лягічна абгрунтаваныя доказы віны, а, кажучы словамі адваката Арсеня Скаруліса, на здагадкі. Гэта кінулася ў вочы пры вывучэньні матэрыялаў справы нават абвінаваўцу М.Казюку. Любы спэцыяліст, незаангажаваны юрыст і сумленны чалавек са здольнасьцю мысьліць лягічна, сказаў бы тое самае. Адзінае, бадай, з чым ня мог пагадзіцца пракурор — тое, што «ўкраінская» справа мае характар палітычнай. Ён адзначыў, што, магчыма, справа гэтая не крымінальная, а адміністратыўная —тады незразумела, чаму ўкраінцы сядзяць у турме замест таго, каб заплаціць пэўную суму штрафу ці атрымаць іншую адпаведную меру пакараньня. Адвакаты патрабавалі асуджаных апраўдаць. Абодва бакі настойвалі на пераглядзе справы...

У той дзень прэзыдэнт Лукашэнка, як чакалася, павінен быў падпісаць закон аб амністыі, але пакуль судовая калегія пад старшынствам І.Федарынчыка ішла да свайго няўмольнага рашэньня, побач зь Вярхоўным Судом пачалася эпапэя з Цэнтарвыбаркамам...

У чаканьні перамогі прэзыдэнта на рэфэрэндуме беларускія «органы» пачалі зьбіраць «кампрамат» на ўсіх, хто знаёмы хоць з адным сябрам УНА-УНСО, хто асьвятляў у прэсе некаторыя зьвязаныя з гэтай і нашымі апазыцыйнымі партыямі падзеі, хто па-людзку ставіцца да палітычных вязьняў увогуле і вязьняў Валадаркі ў прыватнасьці. Ц.Клыкоўская, маўляў, артыкулы на старых улётках пісала... Ды Бог з вамі! Я часам пішу на паперах са старымі зводкамі МУС на адвароце, у якіх — статыстыка забойстваў ды крадзяжоў. Ад гэтага ў мяне не дадаецца любові да чалавека з прозьвішчам Лукашэнка. Упэўненая, што ня поўняцца гэтым пачуцьцём і мужчыны ў пагонах рознага кшталту. Начальнік спэцназу, напрыклад, дый ня ён адзін, трымае на ўсялякі выпадак заяву аб адстаўцы ў шуфлядзе. У іх — прысяга, у іх найперш — выкананьне загаду... Аднойчы мы гаварылі пра гэта з адным вайскоўцам, які мусіў выконваць загад падчас крывавых падзеяў у Вільні. Пасьля таго ён кінуў армію, і цяпер ведаеце дзе? На Валадарцы! Ва УНСО!..

Напярэдадні рэфэрэндуму ва ўсіх установах, як кажа міліцыя ля будынку Канстытуцыйнага Суда, «звычайны рабочы дзень і ніякіх паседжаньняў». У Мінюсьце — таксама. Ад Мінюсту цяпер ладная частка насельніцтва чакае афіцыйнага тлумачэньня закону аб амністыі. Ва Ўкраіне тым часам газэты пішуць, што ўсе сем іхніх грамадзянаў — вязьняў Валадаркі амністыі падлягаюць. Альбо — усе, апрача Патапава і Шаптыцкага. Сваякі аднаго зь іх патэлефанавалі мне і папрасілі растлумачыць. Я не асьмелілася браць на сябе ролю Мінюсту, Канстытуцыйнага Суда, прэзыдэнта, Масквы, украінскіх уладаў і беларускай апазыцыі адначасова.

Разам зь іншымі падсьледнымі і асуджанымі ўкраінцы сочаць за падзеямі праз расейскае тэлебачаньне. Валадарка чакае... Можна разумець УНА-УНСО альбо не, але можна растлумачыць прыхільнасьць суседзяў па Валадарцы да асуджаных украінцаў. Цяпер стаўленьне да гэтых сямёх людзей зьмянілася на лепшае. Гульня ў рэфэрэндум дайшла да казыроў, а ўсе мы ў ёй пастаўленыя, па вялікім рахунку, на адну карту... Дарэчы, за час з пачатку траўня, калі ўкраінцы трапілі ў СІЗО, некалькі дзясяткаў вязьняў папрасілі прыняць іх у тую самую «страшную» арганізацыю.

Зусім нядаўна сталі вядомыя дэталі выпадку, што здарыўся на Валадарцы ў першай палове траўня, напярэдадні галадоўкі Андрэя Шаптыцкага. Доўгі час я лічыла чуткі пра гэтую падзею рэклямным захадам самой УНА-УНСО, пакуль не пачула інфармацыю ад людзей, якія ніяк не зьвязаныя з гэтай арганізацыяй.

У траўні ўкраінцаў спрабавалі вызваліць... самі беларускія ўлады. Ім прынесьлі на допыт паперы зь пячаткамі і ўсім, што трэба для даведак аб вызваленьні. Воля куплялася за кампрамат на іншых людзей. Трэба было падпісаць паперу з пэўнымі сьведчаньнямі. У іх гаварылася, што сябры УНА-УНСО прыехалі ў Менск па дамове з БНФ, і той заплаціў ім за гэта вялікую суму грошай. Да гэтага дазвалялася дадаць словы раскаяньня ва ўчыненым і выказаць пачуцьцё падманутасьці ці то Карчынскім, ці то Пазьняком, ці то нават амэрыканскай контарвыведкай...

Гэта быў пэрыяд таго самага «мянтоўскага самавольства», згаданы ў цыдулцы Шаптыцкага, якую яму ўдалося перадаць на волю (гл. кнігу «Менская вясна — 96»). Але выбіць згоду на куплю свабоды і гонару не ўдалося ні ў кога зь сямёх.

Як кажуць у такіх выпадках, «з гэтымі людзьмі я б пайшоў у выведку». Між іншым, толькі рашэньне суда ў Маскве адкласьці справу Валерыі Навадворскай прымусіла таго ж Шаптыцкага адмовіцца ад ідэі аб'явіць галадоўку ў яе падтрымку.

Сёньня, калі прадаецца беларуская незалежнасьць, нармальны пункт гледжаньня на нашыя падзеі ў расейскай Думе выказалі адно дэпутаты «Яблыка». Усе астатнія раяць мірна дамовіцца з Лукашэнкам і жыць гэтак далей! Мірна дамовіцца з жалезнай машынай, што з гучным ляскатам наяжджае на нашыя сьвядомасьці і, прабачце, нэрвы сваімі тракамі?!

Яны «адтуль» не адчуваюць...

**Тацяна Сьнітко**

Пошта

## Рэдакцыі незалежнага тыднёвіка «Наша Ніва»

*Адказ на допіс невядомага нам аўтара Алеся Бурскага пад загалоўкам «Музэй беларускага характару», які зьмешчаны ў газэце №29 ад 21 кастрычніка 1996 г.*

Прачытаўшы гэты допіс, адразу становіцца зразумелым, што яго напісаў чалавек, які імкнецца не дапамагчы нам у будаўніцтве музэю, а толькі нашкодзіць. Бо інакш ён ня ставіў бы такія пытаньні.

«У якой зь беларускіх цэркваў падлога пакрытая лінолеўмам?»

А няўжо падлогу царквы засьцілаць пэрсідзкімі дыванамі, ці зусім не засьцілаць нічым і няхай псуецца помнік драўлянай архітэктуры XVIII ст., пакрываецца васковымі плямамі ад запаленых сьвечак?!

«Дзе могуць пакласьці падлогу з сантымэтровымі шчылінамі між дошкамі, кожную дошку прыбіваючы тузінам цьвікоў?»

Няўжо ня мог дапытлівы аўтар здагадацца, што гэта зроблена знарок? У неацяпляльнай: зь няcталым тэмпэратурным рэжымам пабудове, як наша царква, падлогу моцна не ўшчыльняюць, пакідаюць зь невялічкімі шчылінамі, каб дошкі адчувалі свабодна, не карабаціліся ад вільгаці ў халодны пэрыяд, дзеля гэтага яшчэ і прыбіваюць іх «тузінам цьвікоў».

«Дзе могуць трымаць унікальныя драўляныя пабудовы з саламянымі стрэхамі без гліняных канькоў?»

Тут аўтар чамусьці не заўважыў, што амаль на кожнай страсе зробленыя надзейныя, трывалыя канькі, залітыя растворам з цэмэнту, пяску і кастрыцы, гэта нашмат трывалей, чым з гліны, і прыціснутыя зьверху драўлянымі козламі. А дзе няма такіх канькоў, там іх і ня можа быць, бо будавалася ўсё згодна з праектам і з тым, якая страха была некалі ў гаспадара.

«Дзе працуе процьма народу, а ўсё пазарастала бур'яном?»

Дзіва, як аўтар змог прабрацца ў наш музэй праз бур'ян і здолеў празь сьцяну бур'яна ўбачыць усё, пра што ён піша? Напэўна, ён ішоў той дарогай, сапраўды ўбур'янелай, якую не дабудуюць ніяк нашы падрадчыкі дарожнай службы. Нашы ж дарожкі і сьцяжынкі, якія пратапталі ўдзячныя госьці — наведнікі з усяго сьвету, заўсёды ўпару абкошаныя і прыбраныя. Не абкошваем толькі запаведныя тыя мясьціны — сажалкі, кустоўе, — дзе водзяцца рэдкія птушкі.

«У якім яшчэ музэі сустрэнеш п'яных зюзікаў апоўдні?»

Дзякуй аўтару за такое калярытнае народнае слоўца «зюзікі». Сапраўды кажуць у народзе: «Вунь як назюзюкаўся, ледзь ідзе!» Напэўна, аўтар быў у музэі ў нейкае вялікае сьвята і мог бачыць, як весяляцца, пяюць і танцуюць удзельнікі ігрышча, і яму стала зайздросна, што яго не запрасілі ў карагод.

«На жаль, пакуль адзіны менскі музэй, якім шчыра захапляюцца іншаземцы, дабудуюць, першыя экспанаты, напэўна, пасьпеюць струхнець».

Дзякуй аўтару, у якога міжволі вырвалася сапраўднае пачуцьцё ад убачанага, калі кажа, што наш музэй — «адзіны менскі музэй, якім шчыра захапляюцца іншаземцы». Гэтым выказваньнем ён перакрэсьлівае ўсе тыя словы, якімі ахайвае наш музэй.

«Стаяць няпаленымі і недагледжанымі шэдэўры безназоўных геніяў-дойлідаў...»

Ці ж аўтар сапраўды хоча, каб гэтыя «шэдэўры безназоўных геніяў-дойлідаў» былі спаленымі, пайшлі агнём і дымам, калі ён так заяўляе? Чамусьці ён ня ведае, што помнікі ў музэях-скансэнах, якім зьяўляецца і наш музэй, знарок не пратопліваюць, гэта забараняецца музэйнымі і супрацьпажарнымі правіламі.

«... запаўняюцца брудам несапраўдныя калодзежы, адцьвітае засеяная наготкамі ніва».

Калі ж аўтару так хацелася натаііцца вадой, чаго ж ён не зьвярнуўся да нашых наглядчыц, якія даглядаюць помнікі? Прыгожыя, чароўныя жанчыны і дзяўчаты з задавальненьнем напаілі б яго сьцюдзёнай крынічнай вадой, з той бруістай крыніцы, што на беразе Пцічы, далі б у дарогу гэтай жывой вадзіцы, а ў дадатак, пачаставалі б гарбатай зь мяты і чабару, далі б лекавых кветак-наготак. І расквітнела б у Алеся Бурскага душа, і ўжо такога злоснага ліста не напісаў бы ў рэдакцыю. Ад'яжджаючы з музэю, пакінуў бы ў «Кнізе водгукаў» свае сапраўдныя ўражаньні з удзячнасьцю і, магчыма, з крытычнымі, але кампэтэнтнымі заўвагамі і прапановамі, як палепшыць і паскорыць будаўніцтва музэю.

*Ад імя Белдзяржмузэю народнай архітэктуры і побыту загадчык навукова-экспазыцыйнага аддзелу*
**Ўладзімер Пецюкевіч**

# Мы любім опэру

Пасьпяхова прайшоў канцэрт зорак расейскай эстрады ў падтрымку прэзыдэнта А.Лукашэнкі, які БТ трансьлявала 22 лістапада. Я ўвогуле ня супраць зорак, тым больш такіх дарагіх і знакамітых, якія былі запрошаныя беларускім бокам, але тое, што канцэрт адбыўся ў памяшканьні Вялікага Тэатру Опэры і Балета РБ (цяпер — прэзыдэнцкага) выклікае непаразуменьне і прымушае паставіць некалькі пытаньняў:

1. Цікава, ці выступаў калі-небудзь Майкл Джэксан у Metrapolitan Opera, а Тото Кутуньё у La Scala?

2. Ці змогуць «на-найцы» прайсьціся праз усю залю па сьпінках крэслаў у Вялікім Тэатры ў Маскве, як яны гэта зрабілі ў Менскай Опэры?

3. Ці ня варта нашаму, ці — прэзыдэнцкаму і таму народнаму, тэатру невялікую перабудову ў зале, а то наш народ любіць ня толькі «папсу», але й паказальныя баі прафэсіяналаў на рынгу?

4. А што там Мая Плісецкая?

**Кірыл Насаеў**, *Менск*


"Наша Ніва" незалежны тыднёвік НАША НІВА

заснаваны ў 1906, аднооўлены ў 1991

| | |
|---|---|
| заснавальнік і выдавец | Павал Жук |
| рэдактар | Сяргей Дубавец |
| адказны сакратар | Алег Дзярновіч |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| навіны | Уладзімер Бараніч |
| рэдактар дадатку "Інфарматар" | Андрэй Лапцёнак |
| макет | Віктар Корзун |
| вёрстка | Іна Жызьнеўская |
| набор | Тацяна Чуйвід |
| стыль і карэктура | Паўлюк Канавальчык |
| пры ўдзеле | Сяргея Шупы |
| прадстаўнік рэдакцыі ў Гомелі | Зьміцер Бартосік (тэл. 56-94-36) |

АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ
220123 Менск, в/с 71

| | |
|---|---|
| Тэл./факс | 239-78-49 |
| E-mail: | edit@niva.minsk.by |
| Падпісны індэкс | 63125 |

Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4-га ліпеня 1996 г., выдадзенае Дзяржаўным камітэтам друку Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, пр. газэты «Известия», д. 8, кв. 173.

# Канец Маркотнай Рэвалюцыі

Беларусь — унікальная краіна. Цяпер гэта вядома й беларусам, і астатняму сьвету. Цяпер мы разам спрабуем зразумець і прамовіць беларускую ўнікальнасьць.

Нядаўна мне давялося пачуць уражаньні аднаго вядомага маскоўскага журналіста ад візыту ў Менск. Ён казаў, што Расея вельмі заклапочаная падзеямі ў Беларусі, што гэтая цікаўнасьць вынікае з таго, што Расея пачала губляць кантроль над сваім стратэгічным «малодшым братам», перастала яго разумець. Ён казаў, што замест краіны, ахопленай рэвалюцыйным агнём, ён застаў гэткую ўсходнеэўрапейскую Швайцарыю: чыстую, ахайную, вонкава сытую. Натуральна, журналіст крыху «лукавил», ведаючы, што гэтая адносная «сытасьць» трымаецца на расейскай фінансавай падтрымцы. Але галоўнае ягонае ўражаньне палягала ў кантрасьце паміж палітычнымі падзеямі, якія ў іншай краіне сапраўды прывялі б да грамадзянскай вайны, і рэакцыяй насельніцтва. Высновa рабілася прыблізна такая — у Беларусі няма маса-вага грамадзянскага супрацьстаяньня, бо ў апазыцыі няма сапраўднага лідара. То бок, няма адзінай ідэі.



Здымак Уладзіміра Шлапака

Слова «ідэя» — ключавое. Людзей, якія прадукуюць ідэі, Беларусь мае ня менш, чым іншыя краіны. Але складанасьць сытуацыі ў тым, што ўласныя ідэі нараджаюцца толькі сёньня. Я маю на ўвазе не глябальныя звышідэі, кшталту Адраджэньня ці Імпэрыі, а ідэі канкрэтнага часу, утылітарныя. Ідэя Незалежнасьці ўжо ператварылася з рамантычнай ў канкрэтную й рацыянальную. А пагроза страты незалежнасьці справакавала іншую — новую для беларусаў ідэю Законнасьці. Праблема ж у тым, што беларускі спажывец ідэяў карыстаецца «чужым агародам». Што аб праблемах Закону й Правоў чалавека можна пачуць хаця б у адным з расейскіх тэлеканалаў пасьля безьлічы мірных ахвяраў у Чачэніі? Расейцы абсалютна шчыра зьдзіўляюцца, чаму мы дагэтуль не забіваем адзін аднога. Зь іхняга гледзішча, паводзіны беларусаў у сёньняшняй палітычнай сытуацыі несалідныя й правінцыйныя. А беларус глядзіць расейскі тэлеканал і суперажывае іхняе неразуменьне беларуса. І бачыць, што ўнікальнасьць ягоных паводзінаў палягае ў тым, што ён сядзіць дома перад тэлевізарам, а не ў акопе з аўтаматам.

У 1994 годзе беларускія спажыўцы ідэяў зьмянілі сабе ўладу паводле прынцыпу "памяняем старое на новае, горш ня будзе». Цяпер яны ў разгубленасьці — ці «горш» ужо наступіла, ці трэба пачакаць? Унікальнасьць беларусаў у моцным рацыяналізме. Паміраць ці забіваць за ідэю — ірацыянальна. Вось бездань паміж намі й Расеяй, вось масток, які зьвязвае нас з Эўропай.

Матывы вайны — рацыянальныя. Акрамя фанатыка, хто хоча ваяваць? Гандляр зброяй, найміт, і... той, хто хоча выжыць. Беларус ня будзе ваяваць, пакуль у яго ня стрэляць. Беларус ня стрэліць у беларуса дзеля ідэі. Праўда, у гэтай формуле трэба зрабіць папраўку. У 1994 годзе рацыянальныя беларусы выбралі не СВАЙГО, як яны думалі. Яны пусьцілі пасьвіцца ва ўласны агарод ірацыянальнага «едача капусты». Ірацыянальнае — непрадказальнае.

Мы ўжо амаль год з трывогай чакаем першага стрэлу. Я бачу тры рацыянальныя варыянты рэагаваньня на стрэл: уцячы; перайсьці на бок таго, хто страляе; стрэліць у адказ. Але выбар залежыць ад ірацыянальнага, ад ідэі, ці ейнай адсутнасьці. Праблема ў шматлікасьці й неакрэсьленасьці грамадзкіх ідэяў беларусаў. У такой сытуацыі даволі лёгка гуляць бяз правілаў. Прэзыдэнт А.Лукашэнка ў 1994 годзе здолеў навязаць беларусам сваю гульню бяз правілаў. Але з таго часу поле грамадзкіх ідэяў стала больш выразным і акрэсьленым, полем, на якім засталося мала месца для гульні прэзыдэнта.

Прэзыдэнт не пакідаў за сабою мастоў. Цяпер ён дагуляўся да мяжы, калі трэба альбо здацца, альбо распачаць страляніну «напасьледак». Як бы не разгортваліся далейшыя падзеі ў краіне, відавочна, што ён вычарпаў свой патэнцыял і застаўся сам на-сам са сваёй гульнёй: электарат ня выйшаў на пляц дзеля падтрымкі, шэраг міністраў падалі ў адстаўку, расейскія ўлады, забраўшы ядравую зброю, і пакрыўдзіўшыся за прыніжэньне (васал вымусіў прыехаць да яго ажно трох гаспадароў!), схаладнелі да свайго кішэннага, як ім падавалася, «аб'едзяніцеля». Прэзыдэнт застаўся адзін.

24 лістапада быў апошні дзень Маркотнай Рэвалюцыі, якая падмяніла сабой чаканую Гарачую Восень. Прынцыповасьць парлямэнту сталася станоўчай неспадзеўкай. Адмоўнай неспадзеўкай сталася пасыўнасьць рабочых. Зь сёньняшняга дня пачаўся этап Пасьля Рэфэрэндуму. Ён убярэ ў сябе безьліч зьменаў і драматычных падзеяў. Але я ўпэўнены, што незалежна ад абставінаў, мы ніколі ня будзем шаптаць на кухнях словы «Жыве Беларусь!» Гэтыя словы ня створаныя для шэпту.

**Севярын Квяткоўскі**

# Публічны суд — на парадку дня нацыі

## Публічны суд

Народ мае права вырашыць свой лёс! — патасна сьцьвярджае адзінае ў Беларусі прэзыдэнцкае радыё і тэлебачаньне. У нас даўно ўжо гавораць ня думаючы. Словы, словы, словы... Што такое народ? што такое права? што такое свой лёс?

Лёзунг павінен быць просты і няясны, — казалі гітлераўскія ідэолягі. І дадавалі — чым больш нахабная хлусьня, тым больш ёй вераць.

«Карупцыя будзе квітнець пышным цьветам, калі карупцыянэрамі людзей будуць называць ня суд, а Лукашэнка і іншныя падобныя да яго палітыкі, якія шалеюць ад жаданьня атрымаць уладны партфэль» (Уладзімер Замяталін, «Вечерний Минск», 31.03.1994).

Можна прывесьці тысячу прыкладаў адкрытай хлусьні, якая ліецца з эфіру на ўдзячную глебу. Людзі чуюць тое, што хочуць пачуць. Дакладней — што хоча пачуць самая цёмная частка іхніх душаў. Бо ў душы ў кожнага чалавека сядзіць клубочак дзікунства, які патрабуе, каб кіраваў усім ня розум, а інстынкты, не законы, а стыхія натоўпу, не мараль, а гвалт. Гэта нельга выкараніць дарэшты, можна толькі ўтаймаваць — культурай, законамі і маральлю, — тым, што называецца цывілізацыяй.

Два з паловай гады назад у Беларусі стаў прэзыдэнтам А.Лукашэнка. Два з паловай гады ён упіраецца ў культуру, законы і мараль — у цывілізацыю. «Яны» напрымалі законаў, якія ён ня можа выконваць. Ня ён кепскі, а законы. І таму ён ня будзе іх выконваць, ня трэба іх выконваць. А раз яму ня трэба, то і ўсім ня трэба. Не выконвайце законы, бо яны дрэнныя! А што тады выконваць?

Так разбураецца найважнейшы прынцып — сьвядомага законапаслушэнства, павагі да права. Гэта найважнейшы прынцып таго, што звычайна называюць парадкам у краіне. Парадак можа трымацца альбо на сьвядомым законапаслушэнстве альбо на ўсеагульным страху перад уладай.

Я не хачу не выконваць законы! З пункту гледжаньня А.Лукашэнкі я — злачынец, мяне трэба судзіць. З майго пункту гледжаньня трэба судзіць яго.

Дакладней, у ягонай асобе трэба раз назаўсёды публічна судзіць той клубок дзікунства, які сядзіць у нашым народзе і замінае яму стаць нармальным цывілізаваным народам.

Мабыць кожны народ у сьвеце рана ці позна мусіць прайсьці праз свой суд над А.Лукашэнкам. Гэта неабходная цывілізацыйная мера, якая ўсталёўвае ў грамадстве сьвядомае законапаслушэнства.

Для нас патрэба публічнага суда над дзікунствам, хамствам, ваяўнічым невуцтвам — становіцца на парадак дня сёньня. Толькі так можна вярнуць традыцыйныя каштоўнасьці — законапаслушэнства, пашану да розуму і таленту, патрыятызм і жывую культуру.

## Нацыя паэтаў

Яшчэ ніколі — з часоў чорнае сотні — наша мова, культура, нацыя не цярпела столькі зьнявагаў, колькі вось ужо два з паловай гады церпіць ад прэзыдэнта электарату. Прасьцяцкія, а па сутнасьці хамскія выпады на адрас ерархаў царквы, літаратуры, навукі, падаюць на ўдзячную глебу. Днямі адна цётка тлумачыла аднаму прафэсару: «Галасую за Лукашэнку толькі таму, каб вы — інтэлігенцыя — ня думалі, што вы невесьць якія цацы. Лукашэнка вам паказаў, што вы — такое ж г., як і я».

Лукашэнка — чалавек з бальшавіцкімі ўстаноўкамі — увасобіў у жыцьцё ленінскую тэзу пра тое, што «интеллигенция — говно», г.зн. зрабіў тое, чаго не наважыліся зрабіць ні Сталін, ні Брэжнеў, ні нават сам Ленін. Ён разбурыў у Беларусі грамадзкую ерархію.

Перасталі існаваць аўтарытэты высокай культуры, розуму, прыгажосьці, высакародзтва. Ім на зьмену прыйшлі аўтарытэты «бабак», «папсы», грубай сілы і сам «уважаемый прэзідзент».

Увогуле ў беларусаў заўсёды шанавалася роўнасьць — экзыстэнцыйная, нацыянальная, рэлігійная. Няма сумневу, што гэтая рыса — наш скарб. Але станоўчую, стваральную роўнасьць можна давесьці да абсурду, зрабіць яе інструмэнтам разбурэньня грамадзтва. Гэта калі перастае існаваць агульная для ўсіх сыстэма каштоўнасьцяў, ерархія аўтарытэтаў. Сьледам атрафуецца сыстэма адукацыі, прынцыпы выхаваньня дзяцей... Людзі пачынаюць прыслухоўвацца да свае фізіялёгіі і адбіраюць з культуры толькі тое, што можа непасрэдна ўзьдзейнічаць на полавыя залозы, на страўнік, што выклікае прыток адрэналіну ў крыві. Розум тады — за непатрэбнасьцю — засынае...

Вось чаму ў беларусаў (як і ў любога нармальнага народу) заўсёды шанаваліся вучонасьць, талент, дасьведчанасьць. Людзі абагаўлялі Слова. Ня дзіва, што кнігі ў нас зьявіліся нашмат раней, чым у іншых народаў-суседзяў. Ня дзіва, што вершы паэтаў у нас ведалі на памяць цэлымі вёскамі. Ня дзіва, што аргумэнт «нашто табе вучыцца, галаву сабе дурыць!» — ніколі ня быў у нас папулярным.

Беларусы — хто яны? Што пра нас кажуць іншыя? Добрыя салдаты, добрыя будаўнікі расейскіх чыгунак — за царом... Ні першае, ні другое ўжо, як быццам, не актуальнае. Нацыя прыгожых жанчын — гэта ад Бога. А яшчэ? Беларусы — нацыя паэтаў.

І гэта, бадай, усё, за што нас ведаюць і цэняць у сьвеце. Не за прэзыдэнтаў, а менавіта за «разных там гілевічэй», як кажа А.Лукашэнка. Пра В.Быкава — найбольш верагоднага ад беларусаў Нобэлеўскага ляўрэата, Лукашэнка наогул маўчыць... Так разбураецца ерархія грамадзтва.

Ужо некалькі гадоў доўжыцца крызыс у нацыянальнай культуры. Ён зьвязаны зь няпэўнасьцю лёсу краіны, з аб'ектыўнай палітызацыяй літаратараў і мастакоў. Інтэлігенцыя — галоўны будаўнік грамадзтва — вызначаецца, якое менавіта грамадзтва і разам з кім ёй будаваць. За два з паловай гады А.Лукашэнка пераканаў самых памяркоўных у тым, што штосьці збудаць у Беларусі можна толькі насуперак яму.

Праўда, ёсьць і пры Лукашэнку сякі-такі культурны істэблішмэнт. Найперш гэта прыежджыя расейцы, для іх Менск — нібы расейскі абласны цэнтар: ня Піцер, вядома, але й не Тамбоў. Ёсьць адзінкі кшталту Генадзя Пашкова, які калі і ўвойдзе ў гісторыю, то ніяк не эстэтычнымі здабыткамі. Нарэшце, Міхал Савіцкі — мастак, кшталту Ільлі Глазунова ў Маскве... І ўсё.

Усе астатнія — сотні людзей культуры — ад ціхага «вясковага салавейкі» да прызнанага мэтра — усталі на пазыцыі нонканфармізму, за што і выкінутыя за борт афіцыёзнага карабля. Для беларускай культуры, якая выйшла з камунізму разрозьненай і дэзарыентаванай, гэта ў прынцыпе стваральная сытуацыя. Дзеячы культуры, якія два гады вызначаліся, з кім яны — цяпер аб'ядноўваюцца супраць бескультур'я і маюць шанец стварыць новую, несавецкую ерархію, абноўленую сыстэму нацыянальных аўтарытэтаў, заснаваную на спрадвечных беларускіх каштоўнасьцях. Але легалізуецца гэтая сыстэма толькі пасьля сёньняшняга пэрыяду хамства і зьнявагаў, толькі пасьля публічнага суда над дзікунствам.

* * *

Суд стаіць на парадку дня нацыі. Суд публічны — юрыдычны (за парушаныя законы), маральны — за хлусьню, суд нацыянальны — за зьняважаную мову, сымболіку і мінуўшчыну.

Народ мае права вырашыць свой лёс! — гэты мэтафарычны папулісцкі лёзунг можа мець і практычнае прачытаньне. Наш, беларускі народ мае права (абавязаны, пастаўлены перад гістарычнай неабходнасьцю) вырашыць свой лёс (вырваць, выкараніць зь сябе або заглушыць той клубок дзікунства і дэмаралізацыі, якія сёньня — культывуецца). Народ мусіць зьдзейсьніць самаачышчэньне.

**Алесь Кебік**


Здымак Уладзіміра Шлапака

МІЖНАРОДНЫ КАМЭНТАР

# Расея пачынае дзяліцца

Пад час візыту міністра замежных справаў Расеі Прымакова ў Токіо высьветлілася, што Расея пайшла на даволі цьмяныя для шырокай публікі, але насамрэч вельмі значныя саступкі ў пытаньні Курылаў. У Пэкіне той самы Прымакоў «урэгулёўваў» праблемы, зьвязаныя з дэмаркацыяй мяжы па Амуры. Чачэнію, падобна, адпускаюць на волю.

А ўжо й сапраўды шматпакутныя балкарцы, нацыянальна-вызвольны рух якіх быў крывава задушаны падчас другой сусьветнай вайны, спрабуюць выйсьці са складу фэдэрацыйнай аўтаномнай Карбардзіна-Балкарыі.

У Расеі зьяўляецца цяпер рэдкі шанец падзяліцца сваім караваем, раздаць спрэчныя даўгі. Прэзыдэнт Ельцын будзе цараваць (ці зможа кіраваць?) пяць гадоў: дактары не падвялі. Ягоныя рукі разьвязаныя: праз пяць гадоў ён, відавочна, балятавацца ўжо ня будзе. «Электарат» і апытаньні грамадзкай думкі ня будуць стрымліваць яго так, як гэта было раней.

Прэзыдэнт Ельцын, такім чынам, мае вялікія шанцы пакласьці канец шматлікім канфліктам, якія псуюць дачыненьні Расеі з суседзямі.

Вядома, шкада дзяліцца такімі адвечнымі для кожнага расейскага чалавека мясьцінамі, як Курылы, Чачэнія ці абтокі на Амуры, але калі ўлічыць, што гэта проста крошкі ад пышнага расейскага караваю, а для японскае душы альбо кітайскага страўніка яны нешта ўсё ж азначаюць, дык чаму б і не падарыць?

Хто і што хоча адшчыкнуць ад каравая? Фіны паспрабуюць выпрасіць Выбарг зь ленінскім буданом у Разьліве. Эстонцам і латышам іхныя балотныя паветы наўрад ці аддадуць.

Беларусы падзяліліся на дзьве паловы: адна хоча забраць у Расеі славу краіны, якую «развагаю не зразумець, на кшталт агульны не памераць», а другая чакае ад Расеі дапамогі ў барацьбе за незалежнасьць.

Ёсьць яшчэ Калінінград — ладны кус. Ёсьць Каўказ, пра які Іван Рыбкін сказаў: «Чаму вы пытаецеся толькі пра Чачэнію? Мы гатовыя вырашыць ня толькі праблему Чачэніі, але й праблему ўсяго Паўночнага Каўказу». Гучыць інтрыгоўна.

Толькі ўкраінцам не шанцуе. Усюды Масква ідзе на кампрамісы, толькі не зь Севастопалем. Севастопаль — найсьвяцейшае: яго ці то Сувораў браў, ці то Нахімаў здаваў. Дзяржаўная Дума Расеі аднагалосна выказалася за расейскі лёс севастопальскіх ільвоў і бухтаў.

Дык што, з дэмакратаў засталася адна Навадворская? (І тую судзяць.) Не, вядома. Проста Расея заўжды застанецца Расеяй — з Курыламі ці бязь іх.

**Андрэй Рудкоўскі**

# Прэзумпцыя вінаватасьці

*Беззаконьне па-амэрыканску*

Неяк у амэрыканскім тэлевізійным канале NBC паказалі, як тамтэйшыя паліцыянты старанна паласавалі гумовымі дручкамі нейкага небараку. Пасьля дэманстравалася зьнятая скрытай камэрай сцэна спыненьня машыны, якую вяла жанчына-кіроўца зь невялікім перавышэньнем дазволенай хуткасьці. Тады паліцыянт прымусіў няшчасную кабеціну легчы тварам да зямлі на шашу, абшукаў яе, а пасьля, закруціўшы ёй рукі за сьпіну і зашчоўкнуўшы наручнікі, упіхнуў у свой «ментавоз» і павёз у пастарунак. Пасьля паказваліся і кадры зь іншых краінаў, дзе калегі амэрыканцаў таксама мажджэрылі ўсё, што рухалася. А ў канцы перадачы была зробленая выснова, што паліцыянты ўсіх краінаў —амаль браты-блізьняты — хлебам іх не кармі, а дай каму ў каршэль накласьці.

Мала хто зьвярнуў увагу на заяву аднаго амэрыканскага палітыка пару тыдняў таму. Той сказаў, што мае дакумэнты, перададзеныя яму супрацоўнікам ФБР, якія сьведчаць пра прыналежнасьць Пэнтагону да нядаўняй катастрофы Боінга кампаніі TWA, што выбухнуў неўзабаве пасьля ўзьлёту, адправіўшы на корм акулам усіх людзей на борце. Паводле дакумэнтаў, якія паказалі журналістам, самалёт быў выпадкова зьбіты вайсковай ракетай падчас ваенна-марскіх манэўраў. Кіраўніцтва ФБР імгненна адрэагавала на гэта, заявіўшы, што такога ня можа быць, таму што ня можа быць наагул, і катэгарычна адмовілася разглядаць сэнсацыйныя дакумэнты, загадзя назваўшы іх фальшыўкай. Нешта надзвычай знаёмая сытуацыя.

ФБР любіць ня толькі хаваць праўду, але й арыштоўваць невінаватых людзей на падставе іх адпаведнасьці г.зв. «профілю злачынца» (апісаньне росту, голасу, магчымых звычак і г.д.). Напрыклад, шмат гадоў таму у штаце Канэктыкут была раскручаная справа з нагоды сэрыйных забойстваў пяці жанчынаў. Тады быў арыштаваны вулічны прапаведнік Бэн Мілер. Яму не пашанцавала ў тым, што ён добра ўпісаўся ў вызначаны ФБР профіль забойцы: адзінокі шызафрэнік з маніяй праўдашукальніцтва. Напачатку, калі Мілера арыштавалі, ён адчайна даказваў сваю невінаватасьць, але пасьля раптоўна падпісаў прызнаньне. Толькі дзякуючы існавалай тады ў некаторых штатах практыцы адтэрміноўкі вынясеньня сьмяротнага прысуду, Мілер не апынуўся на электрычным крэсьле. А больш чым праз дзесяць гадоў ягоны настойлівы адвакат здолеў высьветліць, што Мілер падпісаў сваё прызнаньне, напампаваны адпаведнымі мэдыкамэнтамі і пад уплывам іншых заходаў для «высьвятленьня ісьціны».

Лёс Бэна Мілера ледзь не паўтарыў і Рычард Джуэл пасьля выбуху на сёлетніх Алімпійскіх гульнях у Атлянце. Нагадаю, што менавіта гэты супрацоўнік аховы алімпійскага парку першым знайшоў бомбу і арганізаваў эвакуацыю людзей. Ён жа й стаў першым кандыдатам у тэрарысты. Зноў-такі на падставе профілю, вымысьленага агентамі ФБР паводле тэлефоннага голасу: мясцовы тоўсты белы чалавек, знаёмы са зброяй. Якраз Джуэл.

Пакуль уся краіна гадала, ці вінаваты Джуэл, і якія яшчэ доказы, апроч яго празьмернай вагі, мае ФБР, мала хто задумаўся пра тое, хто яшчэ мог бы патрапіць у лік патэнцыйных злачынцаў толькі на падставе сваёй адпаведнасьці апісаньню злачынцы. У адрозьненьне ад Мілера Джуэлу пашанцавала: настойлівая ўвага журналістаў да гэтай справы выратавала яго ад лёсу Кэнэта Адамса, Дэніса Ўільямса, Вэрнэла Джымэрсана ды Ўільяма Рэйнджа са штату Ілінойс. Гэтыя няшчасныя правялі ажно па 18 гадоў па вінавачаньні ў цяжкім забойстве, перш чым студэнты-практыканты з факультэту журналістыкі Паўночна-заходняга ўнівэрсытэту не давялі іхнай невінаватасьці. А Дэльбэрт Цібс правёў два гады ў камэры сьмяротнікаў у Флёрыдзе за забойства, учыненае кімсьці ў той час, калі сам ён наагул быў у іншым штаце.

Гэтыя справы і мноства падобных іншых грунтаваліся на адным і тым жа — у пагоні за паказьнікамі і ў імкненьні апраўдваць пры нізкай аддачы выраслыя з году ў год бюджэты сьледчыя будавалі свае пошукі на паўмітычных зьвестках пра ўзрост, вагу ці расавую прыналежнасьць, на, так бы мовіць, прэзумпцыі вінаватасьці. Такая прэзумпцыя пачынае ўжо распаўсюджвацца й на цэлыя групы насельніцтва: некаторыя гуру ад крымінальнай паліцыі прапануюць у прафіляктычных мэтах ізалёўваць падлеткаў-патэнцыйных парушальнікаў парадку ў нечым накшталт нашых спэцкалёніяў — для Злучаных Штатаў абсалютна новая, падказаная, пэўне, нашымі былымі суайчыньнікамі ідэя. Прычым за падставу для ізаляцыі прапануюцца стандартныя профілі, што нібыта загадзя дазваляюць устанавіць будучых джэкаў-трыбушыльнікаў.

Уявім сабе, што справа Джуэла раскруцілася б далей. Што агенты ФБР змусілі б яго наняць адваката, а пасьля выбілі б прызнаньне. У сувязі з новым клінтанаўскім антытэрарыстычным законам за гэтым непазьбежна быў бы вынесены сьмяротны прысуд. Паводле гэтага ж закону, Джуэл нават ня меў бы шанцаў на апэляцыю і перагляд справы. Бо Вярхоўны Суд ЗША ўжо стварыў прэцэдэнт, пастанавіўшы пры разглядзе справы «Гэрэра супраць Колінза», што невінаватасьць ня ёсьць перашкодай для выкананьня прысуду. Толькі цуд ўратаваў Джуэла ад нябачнай за шырмай рукі ката, якая б адкрыла кранік кропельніцы з атрутай.

**Уладзімер Бараніч**

# Доўгі шлях да самасьвядомасьці

*Два тыдні ў Нарвэгіі*

Нарвэгія для беларусаў (дарэчы, як і Беларусь, для нарвэжцаў) — terra incognita. У большасьці нашых людзей існуе ўяўленьне, што Нарвэгія вельмі халодная краіна, ведаюць яе звычайна па імёнах слынных нарвэжцаў: Грыга, Ібсэна, Гамсуна, Амудсэна, Нансэна, Хеердала.

Калі трапляеш у новую краіну, міжволі пачынаеш яе параўноўваць са сваёй. Відавочна, што на цяперашні момант параўноўваць цяжка: радыкальна адрозьніваецца ўзровень жыцьця, палітычнае і эканамічнае становішча, месца ў сусьветнай супольнасьці. Сучасная Нарвэгія — прывабны партнэр для бізнэсу, яна вызначаецца сваёй мадэльлю сацыялізму асаблівага скандынаўскага кшталту і належыць да тых нямногіх краінаў, якія ня маюць зьнешняй пазыкі...

Пэўная агульная інфармацыя. Нарвэгія працягнулася ўздоўж паўночнага ўзьбярэжжа Скандынаўскага паўвострава, яна — ледзь ня самая паўночная краіна Эўропы. Тым ня менш, клімат тут не адрозьніваецца ад астатняй эўрапейскай часткі. Прычына таму — цёплая плынь Гальфстрым. Сярэдняя тэмпэратура ў сталіцы Осла, напрыклад, такая ж, як у Лёндане, Боне або Цюрыху. Тэрыторыя краіны складае 386.958 кв. км. Паводле велічыні яна чацьвертая ў Эўропе, аднак насельніцтва складае ўсяго 4,6 млн. Зь іх 23.375 чалавек эмігранты. Характэрная рыса нарвэжцаў — індывідуалізм, што абумоўліваецца шматвяковым прыгнётам спачатку з боку Даніі, а потым — Швэцыі. Нарвэжцы не прызнаюць чынашанаваньня (ніколі не ўжываюць слова «падначалены»), лічаць, што ўлады не павінна быць шмат, а таму актыўна ўдзельнічаюць у выбарах.

## Час вікінгаў

Гісторыя нарвэжцаў каранямі ўваходзіць у час вікінгаў IX-XI ст. Вікінгі былі славутымі вандроўнікамі. Яны заснавалі шмат пасяленьняў у Англіі, Францыі, Ірляндыі, калянізавалі Грэнляндыю і на 500 гадоў раней за Калюмба дасягнулі берагоў Амэрыкі. Вікінгі заснавалі дзяржаву Ісляндыю, сёньняшняе насельніцтва якой — прамыя нашчадкі нарвэскіх вікінгаў.

Упершыню каралеўства Нарвэгіі было ўтворанае напрыканцы IX ст. Харальдам I Сьветлавалосым. Кароль-вікінг пакляўся, што ня будзе ні галіцца, ні стрыгчыся, пакуль не аб'яднае краіну ў адзінае каралеўства. Пасьля бітвы пад Ставангерам у 885 годзе ён дамогся сваёй мэты і нарэшце ахвяраваў сваімі доўгімі валасамі. Аднак аб'яднаўчы працэс быў цалкам завершаны каля 1060 г. Вывучэньне і ўсьведамленьне ролі і ўплыву вікінгаў у Эўропе паслужыла падмуркам для фармаваньня нацыянальнай самасьвядомасьці напачатку XX ст., калі Нарвэгія стала нарэшце сусьветнай дзяржавай.

## Паміж Даніяй і Швэцыяй

Больш-менш шчасьлівы пэрыяд Нарвэгіі XI-XIII ст. зьмяніўся міжусобнымі войнамі. Але яшчэ горшыя наступствы прынесла эпідэмія «чорнай сьмерці» — чумы. У выніку дзьве трэці насельніцтва былі зьнішчаныя, землі спусьцелі, дзяржава аслабела і трапіла пад уладу Даніі на доўгія 434 гады. Пэрыяд з 1380 да 1814 г. нездарма называецца «доўгай ноччу».

Толькі пасьля паразы Напалеона у студзені 1814 г. Швэцыя прымусіла Данію, якая была саюзьніцай Францыі, перадаць Нарвэгію пад швэдзкую карону. Нарвэгія набывала статус незалежнай дзяржавы з уласнай канстытуцыяй, урадам і народным прадстаўніцтвам, але ў саюзе са Швэцыяй. Пэўна, нарвэжцы не сьпяшаліся пад новы прыгнёт і не адразу прынялі ўмовы саюзу. Пакуль пераможцы дамаўляліся паміж сабой, нарвэжцы выкарысталі свой шанец. Дзевяць месяцаў незалежнасьці былі вызначальнымі для самаідэнтыфікацыі і фармаваньня нарвэскай нацыі. Менавіта тады быў створаны першы парлямэнт (стуртынг), які напісаў і зацьвердзіў Канстытуцыю, якой нарвэжцы карыстаюцца і дагэтуль.

Швэды сілай прымусілі нарвэжцаў увайсьці ў саюз. 10 кастрычніка 1814 г. нарвэскі кароль Крысьціян Фрэдарык, зьняўшы паўнамоцтвы, пакінуў краіну. Саюз са Швэцыяй доўжыўся да 1905 году. Слова «саюз» набыло адмоўны сэнс і да цяперашняга часу ўспрымаецца як нешта абразьлівае і зьнеunion-free зьневажальнае. Нарвэская мова вельмі пацярпела і значна зьмянілася за часы знаходжаньня ў «саюзах». Сапраўдная нарвэская мова захавалася толькі ў Ісляндыі.

## Канстытуцыя

Распрацаваў і напісаў яе Крысьціян Фалсэн, якому дапамагалі яшчэ пяць-шэсьць чалавек, а зацьвердзіў парлямэнт, у які ўвайшлі 112 асобаў.



Дзень Канстытуцыі 17 траўня да сёньняшняга дня — самае вялікае і прыгожае сьвята ў Нарвэгіі. Амаль у кожнай сям'і ёсьць фатаздымкі дзяцей у нацыянальных строях зь дзяржаўным сьцяжком, якія зробленыя менавіта ў гэты дзень. Нарвэжцы захоўваюць памяць і шануюць першых парлямэнтараў — стваральнікаў сваёй Канстытуцыі. У Гістарычнай залі Парлямэнта можна пабачыць іх фатаздымкі.

## Канстытуцыйная манархія

Пасьля атрыманьня незалежнасьці ў 1905 годзе, каб захаваць спрадвечную традыцыю, нарвэжцы выказаліся на карысьць манархіі. Нарвэгія — адзіная краіна, дзе кароль быў абраны. Сёньня тут — канстытуцыйная манархія з поўнай парлямэнцкай дэмакратыяй. Выканаўчая ўлада фармальна належыць каралю, але на практыцы ён ніякім чынам ня можа ўплываць на парлямэнт. Звычайна кароль мае права выступіць перад парлямэнтам толькі адзін раз, каб прадставіць яму на разгляд праграму ўраду на наступны год. Тым ня менш, каралеўская сям'я — вялікі аўтарытэт і карыстаецца падтрымкай насельніцтва.

Выбары ў парлямэнт адбываюцца кожныя чатыры гады. У яго ўваходзіць 165 прадстаўнікоў народа. Мне давялося слухаць у парлямэнце прамову новага прэм'ер-міністра, які заступаў на пасаду. Астатнія пытаньні парадку дня — звычныя для нарвэжцаў і, напэўна, дзіўныя для беларусаў. Адна з гарачых тэмаў дэбатаў, напрыклад, — «дазволіць ці не крамам працаваць у нядзелю». Прыблізна 40% парлямэнтараў — жанчыны. Заробкі ва ўрадзе больш сьціплыя, чым атрымлівае прэм'ер-міністар: 400 000 NOK або 60.000$, што ў 2-3 разы менш, чым атрымлівае журналіст.

## Палітычныя партыі

На апошніх выбарах 1993 г. зь вялікім адрывам перамагла нарвэская лейбарысцкая партыя, яна стаіць на прынцыпах сацыяльнай дэмакратыі асаблівага скандынаўскага кшталту, г.зн. вялікі ўзровень падаткаабкладаньня і пільны публічны кантроль. У цяперашні парлямэнт уваходзяць прадстаўнікі васьмі партыяў: лейбарысты, кансэрватары, партыя прагрэсу, левая сацыялістычная (традыцыйная) партыя, хрысьціянскія дэмакраты, цэнтрысты (аграрыі), лібэралы, чырвоны электарат (камуністы). Усе партыі атрымліваюць фінансавую падтрымку ад дзяржавы ў залежнасьці ад колькасьці сяброў.

## Эканоміка

Паводле справаздачы ААН Нарвэгія належыць да самых эканамічна разьвітых краінаў сьвету з высокім узроўнем жыцьця. Сярэдні заробак складае каля $30.000. Сёньня ў Нарвэгіі пасьпяхова разьвіваецца машынабудаваньне і кампутарныя тэхналёгіі. Зьнешні гандаль складае 43,45% ВНП. Гідраэлектраэнэргетыка — вельмі важная галіна эканомікі. 15,9% ВНП прыносіць нафтавая і газавая вытворчасьць. На долю нарвэскіх судаўладальнікаў прыпадае 10% сусьветнага флёту. Беспрацоўе мае традыцыйна нізкі ўзровень. Абумоўлена, што ўзровень беспрацоўя ня можа перавышаць лічбы 150.000 чалавек.

Нарвэгія — вельмі прыгожая краіна. Нарвэжцы — сьціплыя і працавітыя людзі з добрым густам і цягай да прыгажосьці. Большасьць зь іх жыве ў невялічкіх дамах, якія выглядаюць так, быццам іх толькі ўчора пафарбавалі. Стрыманы паўночны народ аддае перавагу адкрытай прасторы: нарвэжцы ніколі не завешваюць вокны фіранкамі. Традыцыйна электраэнэргія вельмі танная, а таму, вяртаючыся пасьля працы дахаты, яны запальваюць сьвятло адначасова ва ўсіх пакоях, прычым адначасова некалькі лямпаў. Вокны розных памераў з бездакорна чыстым шклом, якія падсьвечваюцца самымі неверагоднымі лямпамі і лямпачкамі, аздобленыя кветкамі, расьлінамі, нейкімі фігуркамі, ствараюць казачнае ўражаньне і сьвяточны настрой.

**Таіса Бандарэнка**

*На здымку: усе 112 стваральнікаў першай нарвэскай канстытуцыі ўшаноўваюцца ў Гістарычнай залі Парлямэнту.*

# Ці добры Вы выхавальнік

*У табліцы N 1* адшукайце свой варыянт адказу на пытаньне.

| № | Пытаньне | Варыянт адказу: Так — заўсёды, у любым выпадку, рэгулярна, безумоўна і г.д. | Зрэдку — у некаторых, выпадках зрэдку, у меру неабходнасьці і г.д. | Не — ніколі, ні пры якіх абставінах, ні ў якім разе і г.д. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| I | Ці адказваеце Вы на некаторыя пытаньні дзіцяці: "Я скажу табе, калі ты падрасьцеш?" | | | |
| II | Ці даеце дзіцяці грошы на дробныя выдаткі? | | | |
| III | Калі Вы адмаўляеце дзіцяці ў чым-небудзь, ці тлумачыце Вы яму прычыну? | | | |
| IV | Ці дазваляеце Вы дзецям дапамагаць па гаспадарцы, нават ведаючы, што карысьці ад гэтай дапамогі мала ці зусім няма? | | | |
| V | Ці лічыце Вы дапушчальнай невялікую ману адносна дзяцей? | | | |
| VI | Ці карыстаецеся Вы любым выпадкам, каб садзейнічаць разьвіцьцю назіральнасьці ў дзіцяці? | | | |
| VII | Ці дазваляеце сабе Вы ў прысутнасьці дзіцяці крытыкаваць сваіх знаёмых? | | | |
| VIII | Ці лічыце Вы, што дзіця нельга падманваць? | | | |
| IX | Ці лічыце Вы, што маленькім дзецям трэба тлумачыць усе жыцьцёвыя сытуацыі? | | | |
| X | Ці чытаеце Вы кнігі па выхаваньні дзяцей? | | | |
| XI | Ці лічыце Вы, што нават самыя маленькія маюць права на свае таямніцы? | | | |
| XII | Ці здараецца Вам пагражаць пакараньнем дзіцяці, калі ён што-небудзь пакіне ў талерцы? | | | |
| XIII | Ці імкнецеся Вы садзейнічаць таму, каб у дзяцей разьвілася пачуцьцё незалежнасьці і ўпэўненасьці ў сабе? | | | |
| XIV | Ці ўмееце Вы падзяліць радасьць свайго дзіцяці? | | | |
| XV | Ці ахвотна Вы бавіце свой вольны час разам зь дзецьмі? | | | |
| XVI | Ці любіце Вы дэманстраваць таленты сваіх дзяцей? | | | |
| XVII | Ці ўмееце Вы сказаць так, каб Вас адразу ж паслухаліся? | | | |
| XVIII | Калі Вашае дзіця капрызіць, ці здольныя Вы захаваць поўны спакой? | | | |
| XIX | Ці лёгка Вы заводзіце знаёмства зь сябрамі сваіх дзяцей? | | | |

*Табліца N 2*

| Варыянт адказу | Пытаньне | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | I | II | III | IV | V | VI | VII | VIII | IX | X | XI | XII | XIII | XIV | XV | XVI | XVII | XVIII | XIX |
| Так | 0 | 3 | 3 | 4 | 0 | 5 | 1 | 3 | 0 | 4 | 3 | 0 | 5 | 3 | 5 | 0 | 5 | 5 | 4 |
| Зрэдку | 2 | 4 | 2 | 3 | 3 | 2 | 2 | 4 | 3 | 2 | 2 | 1 | 1 | 2 | 1 | 1 | 0 | 1 | 2 |
| Не | 5 | 1 | 0 | 0 | 4 | 0 | 4 | 1 | 4 | 0 | 1 | 4 | 0 | 0 | 0 | 4 | 0 | 0 | 0 |

Падсумуйце набраныя балы.

Меней за 25 балаў. Строгасьць — не адзіны элемэнт добрага выхаваньня. З Вашымі прынцыпамі Вам будзе цяжка зрабіць дзіця вясёлым і ўраўнаважаным чалавекам.

25-56 балаў. Прынцыпы ў Вас, увогуле, правільныя. Але ці не здаецца Вам, што быць толькі лягічным недастакова, трэба быць яшчэ і рэалістычным.

Больш за 56 балаў. Вашая вытрымка і разуменьне дзіцячая псыхалёгіі, безумоўна, скончацца посьпехам. Тыя, хто лічыць Вас добрым выхавальнікам, безумоўна, маюць рацыю.

Верагодна, гэтыя ацэнкі выклічаць спрэчкі і разнагалосьсі. Але не крыўдуйце, калі Вам нешта не падабаецца. Папершае, гульня — гэта гульня, жарт, а падругое, матэрыял для ацэнак кожны даў сам. А па-трэцяе, Вы маеце права і не пагадзіцца з тымі поглядамі на выхаваньне, што выражаныя ў ацэнках за адказы.


У ПАПЯРЭДНІХ НУМАРАХ (№1 – 23):

**Кошты на менскіх рынках:** Камароўка (ІНФ. №1, 7, 10, 21); Рэчавы рынак "Дынама" (ІНФ. №2, 8); Аўтарынак (ІНФ. №3, 12); Кошты на кампакт-дыскі (ІНФ. №4); Кошты на кватэры ў Менску. Кошты на офісы (ІНФ. №5, 17); Кошты на будаўнічыя матэрыялы (ІНФ. №6); Кошты на камп'ютары. Менск (ІНФ. №9); Кошты на філязофска-гуманітарную літаратуру (ІНФ. №18); Кошты на кватэры ў Менску (ІНФ.№24); Кошты на турыстычныя падарожжы ў Менску (ІНФ.№26). Кошты на запасныя часткі для аўто (ІНФ.№27); Кошты на авія і чыгуначныя квіткі (ІНФ.№28).

**Транспарт:** Расклад руху пасажырскіх цягнікоў ад станцыі Менск-Пасажырскі (ІНФ. №1,15); Расклад руху прыгарадных цягнікоў ад станцыі Менск-Пасажырскі (ІНФ. №2, 12); Расклад руху аўтобусаў ад а/с Менск-Цэнтральны і Менск-Усходні (ІНФ. №3, 16, 17); Расклад рэйсаў пасажырскіх самалётаў і ўсё пра аўтазапраўныя станцыі (ІНФ. №5).

**Адукацыя:** Замежнае навучаньне ў 1996 годзе (ІНФ. №1); Платнае навучаньне ў Менску. Камэрцыйныя ВНУ (ІНФ. №2); Дзяржаўныя ВНУ. Платнае навучаньне (ІНФ. №3-4); ВНУ. Акадэміі (ІНФ. №8-10).

**Біржа працы:** Аналіз стану рынку працы паводле зьвестак Менскага гарадзкога цэнтру занятасьці насельніцтва (ІНФ. №1-9); Новыя вакансіі і працоўныя месцы на Беларусі (ІНФ. №1-28).

**Адпачынак:** Вучымся гуляць у прэфэранс (ІНФ. № 1-15); Вучымся гуляць у більярд (ІНФ. № 16-24); Тэсты, шахматныя і інтэлектуальныя задачы (ІНФ. №1- 29).

**Спажывец:** Тэлефонныя коды гарадоў Беларусі, краінаў блізкага і далёкага замежжа (ІНФ. №2); Твае правы, пасажыр (ІНФ. №2); Як купляць і прадаваць кватэру. Што азначае спэцыяльнае маркаваньне (ІНФ. №3); Месяцовы пасяўны каляндар (ІНФ. №4); Як вызначыць якасьць мясных і рыбных прадуктаў (ІНФ. №5); Пра новыя даляры. Праўда пра цыгарэты. Штрыхавы код — як яго расшыфраваць (ІНФ. №6); Як выбіраць абутак (ІНФ. №7); Міжнародная сыстэма гатэляў (ІНФ. №10); Каб вырасла рэпа вялікая...(ІНФ. №11); Як набыць аўтамабіль у Нямеччыне (ІНФ. №18 Заканчэньне); Вучымся эканомна кіраваць аўтамабілем (ІНФ. № 12, 15, 17); Зрабі сам (ІНФ. № 16); Соньнік (ІНФ. № 15, 17, 18 Заканчэньне); Спажывецкі тэст — прасы (ІНФ. № 20); Спажывецкі тэст — тэлевізары (ІНФ. № 21); Кошты на аўто ў Польшчы (ІНФ. № 21, 22); Гумкі (ІНФ. № 23); "Time Share": Як пазьбегнуць непрыемнасьцяў (ІНФ. № 23). Інвэстыцыйныя фонды: некалькі парадаў дробнаму ўкладальніку (ІНФ. № 23); Пырскі шампанскага (ІНФ. № 23); Рыбныя прадукты (ІНФ. №24); Гарэлка: Чаго баяцца? (ІНФ. №24); Каб кватэра была цёплай (ІНФ.№26); Фарбуем вопратку і тканіну (ІНФ.№26); Калі я памяняю батарэйкі (ІНФ.№27). Спажывецкі тэст — кухонныя камбайны (ІНФ.№28).

**Інструктар:** Друкарня ў кожнай кватэры; За родную школу; Зьбіраемся ў падарожжа (ІНФ. № 19); Апэрацыя "ВАГІ" (ІНФ. №24).

**Здароўе:** Перш чым зьвяртацца да лекара. Як кінуць паліць (ІНФ. №4); Прыродныя атруты (ІНФ. №10); Атлетычныя клюбы, шэйпінг, аэробіка, тэнісныя корты (ІНФ. №18); Комплексная ацэнка забруджаньня асяродзьдзя Менску і вобласьці (ІНФ. № 19); Тэст: асьпірын (ІНФ. № 22); Небясьпечныя лекі (ІНФ. № 22); Пра шкоду пасіўнага паленьня (ІНФ. № 22); Без дыэты не абысьціся (ІНФ. № 23); Перш чым купіць цацку, панюхайце! (ІНФ. № 23).

**Гаспадарка:** Газ у нашым доме. Як чытаць цэтлікі на вопратцы. (ІНФ. №5); ЖЭС. Рамонт жытла. Пункты прыёму замоваў на будаўніча-рамонтныя працы (ІНФ. №6); Як мыць і чысьціць посуд. Калі заліло кватэру... (ІНФ. №8); Як пабудаваць садовы домік. Дом і дзялянка (ІНФ. №9).

**Прэс-рэліз**. Сьвет за тыдзень (ІНФ.№28).

**Грамафон:** Старонка вершаванага радка (ІНФ. №6, 8, 11, 17, 19, 20, 24, 25, 26).

**Харчаваньне:** Якую гарбату мы п'ем. Пра часнык (ІНФ. №7); Бары, рэстарацыі, кавярні Менску (ІНФ. №15).

**Спорт:** Вынікі спаборніцтваў і інш. (ІНФ. №7, 9, 19).

**Бібліятэка:** Новыя паступленьні ў кнігарні. Рэцэнзіі (ІНФ. №9, 10, 11, 15, 16, 18-27).

**За мяжою:** Хто такія ньюёрцы; Ліставаньне з навучальнымі ўстановамі ЗША (ІНФ. №17).

**Беларусь і сьвет**. Індзейцы у Беларусі (ІНФ. № 21).

**Адвакат:** Ахова правоў чалавека. Міжнародная Амністыя (ІНФ. №17).

**Псыхалёгія:** Сцэнар чалавечага жыцьця пішацца яшчэ ў дзяцінстве (ІНФ. №24); Калі Ён купаецца, усе павінны залезьці ў ваду і пляскацца (ІНФ. №24).

**Чалавек**: Пра цяжкае жыцьцё і лёгкую сьмерць; Дзёньнік без канца. Г.Матусевіч. Тэст: самая простая памяць (ІНФ. №27)

ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫХ НУМАРАХ:

**Рынак:** Новыя кошты на розныя тавары.

**Грамафон:** Новыя вершы нашых чытачоў.




# Дыпляматычны корпус у Менску.

## Пaслы па сумяшчальніцтву.

**1. Пасольства Аўстраліі**

Адрэса: г.Масква, Крапоткінскі зав., 13. Тэлефон: 956-60-70. Факс: 956-61-70. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп. Джэфры Бэнтлі.




**2. Пасольства Аўстрыйскай Рэспублікі**

Адрэса: г.Масква, Стараканюшаны зав., 1. Тэлефон: 201-73-19/07/79. Факс: 230-23-65. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп.Вальтэр Зігель.

**3. Пасольства Гішпаніі**

Адрэса: г.Масква, вул.В. Нікіцкая, 50, 8. Тэлефон: 202-21-61/80, 202-26-10/57. Факс: 200-12-30. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп. Эўхенэо Брэгалат.

**4. Пасольства Фінляндзкай Рэспублікі**

Адрэса: ul.Klaipedas, 6, Vilnius, Lithuania. Тэлефон: 22-27-75. Факс: 22-24-63. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп. Тайста Талванэн.

**5. Пасольства Каралеўства Швэцыя**

Адрэса: г.Масква, вул.Масфільмаўская, 60. Тэлефон: 956-12-00(01). Факс: 956-12-02. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп. Свэн Хірдман.

**6. Пасольства Сацыялістычнай Рэспублікі Віетнам**

Адрэса: г.Масква, вул.Пірагоўская, 13. Тэлефон: 247-02-12. Факс: 245-10-92. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп. Хуан Нгіем.

**7. Пасольства Новай Зэляндыі**

Адрэса: г. Масква, вул.Паварская, 44. Тэлефон: 956-35-79. Факс: 256-35-83.

**8. Пасольства Каралеўства Нідэрлянды**

Адрэса: ul. Chocimska, 6, 00-791 Warszawa, Polska. Тэлефон: 49-23-51/2. Факс: 48-83-45. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп.Джорджэс Вэры.

**9. Пасольства Вялікага Герцагства Люксэмбург**

Адрэса: г.Масква, Хрушчоўскі зав., 3. Тэлефон: 202-21-71. Факс: 200-52-43.

**10. Пасольства Каралеўства Данія**

Адрэса: г.Масква, зав.Астроўскага, 9. Тэлефон: 201-78-60/68. Факс: 201-53-57. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп. Хэнрык Р. Івэрсэн.

**11. Пасольства Канады**

Адрэса: г.Масква, Стараканюшаны зав., 23. Тэлефон: 956-66-66, 256-61-58. Факс: 241-44-00. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп. Джэрэмі Кінсман.

**12. Пасольства Рэспублікі Зымбабвэ**

Адрэса: г.Масква, Серпаў зав., 6. Тэлефон: 248-43-64/67, 256-31-50. Факс: 230-24-97.

**13. Пасольства Вугорскай Рэспублікі**

Адрэса: ul. Kronina, 2,00-559, Warszawa, Polska Тэлефон: 628-44-51/55. Факс: 621-85-61. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп. Габар Харс.

**14. Пасольства Швайцарскай Канфэдэрацыі**

Адрэса: Al. Ujazdowskie, 27, 00-540 Warszawa, Polska Тэлефон: 628-04-81/82. Факс: 621-05-48. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп.Жан-Аліўе Кэнш.

**15. Пасольства Рэспублікі Карэя**

Адрэса: г.Масква, вул.А.Талстога, 14. Тэлефон: 956-14-74, 956-24-34. Факс: 956-24-34. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп. Кім Сок Кю.

**16. Пасольства Каралеўства Нарвэгіі**

Адрэса: г.Кіеў, вул.Стралецкая, 15. Тэлефон: (044) 224-00-66, 212-43-85. Факс: 224-06-55. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп.Ойвінд Нордслетэн..

**17. Пасольства Ўругвая**

Адрэса: г.Масква, Ламаносаўскі прасп., 38. Тэлефон: 143-04-04. Факс: 938-20-45. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп.Пэдра Донда.

**18. Пасольства Ісламскай Рэспублікі Іран**

Адрэса: г.Кіеў, вул.Круглаўнівэрсытэцкая, 12. Тэлефон: (044) 229-44-63, 229-34-66, 31-11-39, 33-75-82, 33-78-08 (сакратар у Менску). Факс: 229-32-55. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп. Бэхзад Мазахеры.

**19. Пасольства Каралеўства Тайлянд**

Адрэса: г.Масква, Яропкінскі зав., 3. Тэлефон: 201-27-15, 201-48-93. Факс: 201-28-53.

**20. Пасольства Рэспублікі Куба**

Адрэса: ul. Rejtana 15 m. 9, 02-516 Warszawa, Polska Тэлефон: (8-10-48-22) 48-25-73, 48-17-15. Факс: 48-22-31. Тэлекс: 483588 cuba pl. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп. Анна М.Р. Інхідуа.

**22. Пасольства Мэксыканскіх Злучаных Штатаў**

Адрэса: г.Масква, вул.Шчукіна, 4. Тэлефон: 201-23-28, 201-22-97. Факс: 230-20-42. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп. Абэларда Трэвіньня.

**23. Пасольства Аргентынскай Рэспублікі**

Адрэса: г.Масква, вул.Садовая-Трыюмфальная, 4-10. Тэлефон: 299-16-70, 299-23-29. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп. Арнольд Мануэль Лістрэ.

**24. Пасольства Ірляндыі**

Адрэса: г.Масква, зав.Грахольскі, 5. Тэлефон: 288-41-01, 280-65-00. Факс: 975-20-66. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп. Ронан Мэрфі.

**25. Пасольства Каба-Вэрдэ**

Адрэса: г.Масква, вул. В. Спаская, 9. Тэлефон: 208-07-63, 208-08-56. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп. Луіш Фансэка.

**26. Пасольства Рэспублікі Кіпар**

Адрэса: г.Масква, вул.Герцэна, 51. Тэлефон: 291-37-26. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп. Антоніс Вакіс.

**27. Пасольства Рэспублікі Кенія**

Адрэса: г.Масква, вул.В. Ардынка, 70. Тэлефон: 237-34-62, 237-47-02. Факс: 230-23-40. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп. Дыксан І. Катамбана.

**28. Пасольства Фэдэратыўнай Рэспублікі Бразылія**

Адрэса: г.Масква, вул.Герцэна, 54. Тэлефон: 290-40-26. Факс: 200-12-85. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп. Тэрэза Марыя Машаду Кінтэла.

**29. Пасольства Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі**

Адрэса: г.Кіеў, вул.Чырвонаармейская, 9/2 комплекс "Макулан", 7. Тэлефон: 227-71-72. Факс: 220-72-06. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп. Дыён ван Скуер.

# Археалягічнае лета:
## *пошукі, адкрыцьці, сэнсацыі*

Археалёгія — навука карпацыйная. Усе яе адкрыцьці, прынамсі ў Беларусі, звычайна асядаюць у навуковай літаратуры і застаюцца набыткам даволі вузкага кола спэцыялістаў. У нас рэдка зьяўляюцца археалягічныя опусы папулярнага кшталту, што, безумоўна, аддаляе шырокую аўдыторыю ад вынікаў навуковай творчасьці.

Недахоп даступнай археалягічнай інфармацыі заўсёды шкодна адбіваецца на грамадзкай сьвядомасьці, прытупляючы гістарычную памяць, прыніжаючы годнасьць, пазбаўляючы ўпэўненасьці ў сваім існаваньні. Любое археалягічнае адкрыцьцё, якое сталася набыткам шырокай публікі, — моцны штуршок да асэнсаваньня людзьмі сваёй гістарычнай вартасьці. Нездарма ў многіх краінах сьвету ў крытычныя моманты археалягічныя сэнсацыі часта выконвалі ролю магутных грамадзкіх каталізатараў.

У людзкой сьвядомасьці археалёгіі даволі часта спадарожнічае мройны вобраз счарнелай пасудзіны з багатым скарбам. Так, лёс беларусаў праз шматлікія войны і гвалт моцна зьнітаваны з схаванымі скарбамі, а значыць, з заўсёдным спадзяваньнем на лепшыя часы. Аднак археолягам варта паруліцца пра тое, каб успрыняцьце іх як шукальнікаў закапаных багацьцяў засталося ў рамантычным мінулым. Сэнс археалягічнага адкрыцьця — у вывучэньні багатага на новую гістарычную інфармацыю помніка.

Кожны археалягічны сэзон прыносіць вялікую колькасьць зыходнага матэрыялу для напружанай аналітычнай працы, у выніку якой і паўстае перад намі імглісты вобраз мінуўшчыны. Што шукалі і што знайшлі беларускія археолягі гэтым летам? Я імкнуўся сустрэцца з большасьцю маіх калегаў у Інстытуце гісторыі, якія вялі палявыя археалягічныя дасьледаваньні. У гэтых зацікаўленых гутарках і нарадзіліся караценькія інфармацыйныя паведамленьні пра археалягічнае лета 1996 г.

**ГЛУСК.** Раскопкі на тэрыторыі Глускага замка яшчэ ў 1988 г. пачынаў Генадзь Сагановіч. Тады мясцовымі ўладамі рэшткі фартэцыі былі разраўняныя пад будаўніцтва стадыёна. Летам 1996 г. Ірэна Ганецкая і Генадзь Сагановіч працягвалі дасьледчую працу на месцы замчышча. У выніку раскопак удалося выявіць невядомыя раней сьляды замкавага палаца XVII ст., а таксама будынка XVIII ст.

Глускі замак пачаў будавацца з дрэва яшчэ ў XVI ст. На мяжы XVII-XVIII ст. на яго месцы былі ўзьведзеныя пяцібастыённыя мураваныя ўмацаваньні, апярэзаныя глыбокім ровам. Апошні быў настолькі шырокі, што мост на ім складаўся зь некалькіх пад'ёмных сэкцыяў «узвода», а на мосьце стаяла прамежкавая брама. Ад замка, акрамя іншага, захаваліся скляпеністыя цагляна-каменныя падземныя збудаваньні — нязьменны сымбаль таямнічасьці нашых старых месцаў.

Ірэна Ганецкая шчыра зьдзіўлялася нязвыклай зацікаўленасьці мясцовых людзей — сталых наведнікаў раскапаных муроў. Ціхі правінцыйны Глуск — ускраіна Магілёўшчыны — абудзіўся, адчуў сябе вартым увагі, бо нарэшце ажыла яго таямніца — стары мураваны замак.

**ГАЙНА.** Як вядома, у 1387 г. Ягайла загадаў узьвесьці каталіцкі храм у мястэчку Гайна, што на Лагойшчыне, прымушаючы хрысьціць мясцовых паганаў — «прыродных літоўцаў». Людміла Дучыц лічыць, што мясцовасьць вакол Гайны доўгі час заставалася балцкім язычніцкім анклавам. Гэта пацьвердзілася адкрыцьцём тут шматлікіх каменных курганоў — пахавальных помнікаў сярэднявечных балтаў.

**БАБРУЙСК.** Пад Бабруйскам Л.Дучыц праводзіла раскопкі дрыгавіцкіх курганоў над пахаваньнем дзяўчынкі. На ёй былі каралі зь сініх і жоўтых, шкляных і сэрдалікавых пацерак. Валасы памерлай перацягваліся скураным паскам, на якім прымацоўваліся колцы і алавяныя падвескі ў выглядзе месячыкаў.

На паўднёва-заходняй ускраіне Бабруйску ўздоўж ракі Бабруйкі некалі было адкрытае селішча II-VIII ст. У гэтым годзе, праводзячы тут раскопкі, Ала Ільюцік знайшла вельмі рэдкую старажытнарымскую манэту імпэратара Марка Аўрэлія (правіў у 160-180 г.). Нумізматыкам вядома, што такія манэты звычайна чаканіліся ў Рыме для ўнутранага карыстаньня. На адным яе баку выбітая выява Антонія Пія — айчыма і папярэдніка М.Аўрэлія, на другім — пахавальнае вогнішча. У эпоху раньняга жалеза рэчы антычнага паходжаньня даволі часта ўжываліся жыхарамі верхняга Падняпроўя, найперш насельніцтвам зарубінецкай культуры. Шкляныя пацеркі, амфары, манэты, шпількі, фібулы, шкляны посуд ды іншыя тавары станавіліся каштоўным набыткам на тэрыторыі Беларусі, трапляючы з рымскіх правінцыяў шляхам менавага гандлю праз паўднёвых суседзяў. Марк Аўрэлій, ратуючы сваю імпэрыю, ваяваў са шматлікімі яе ворагамі. На працягу трох гадоў доўжылася вайна з сарматамі, якія мелі даволі добрыя сувязі з паўночнымі суседзямі — жыхарамі зарубенецкіх селішчаў і гарадзішчаў. Магчыма праз сарматаў да зарубінцаў на берагі Бабруйкі і трапіла некалі манэта часоў Марка Аўрэлія.


*Наваградзкі замак*

Пад Бабруйскам каля в. Міхалёва ў жывапісным месцы на беразе ракі Алы — левага прытока Бярэзіны, знаходзіцца гарадзішча, якое раскопвалася ў гэтым годзе Міхасём Лашанковым. Месца гэтае было заселенае яшчэ ў часы каменнага і бронзавага вякоў. У эпоху жалеза тут зьявілася ўмацаванае паселішча, у якім ужо з IX ст. жылі дрыгавічы. Ад іх захавалася вялікая колькасьць характэрных упрыгожваньняў: зерненых пацерак, падвесак, мэдальёнаў. Дрыгавічы ўзмацнілі гарадзішча, падсыпаўшы яго валы і заглыбіўшы роў.

**ДУБРОЎНА.** Нямецкі дыплямат і падарожнік З.Гербэрштэйн, праяжджаючы праз Дуброўна, што пад Воршаю, у 1517 г. бачыў вежы драўлянага замка. У XVI-XVII ст. горад шмат разоў трапляў у вір войнаў Вялікага Княства з Масковіяй, становячыся часам адной з апошніх нашых усходніх фартэцыяў у барацьбе з агрэсарамі. Пасол аўстрыйскага імпэратара Мікалай Варгач, пабыўшы тут у 1598 г., адзначаў: «Дуброўна — горад і ў гэтым месцы апошні памежны замак супраць маскалёў. Горад ляжыць на Дняпры, а на другі бок замка працякае рака Дуброўна. Гэты замак шырокі ў акружнасьці, толькі ўвесь драўляны».

Сёлета на месцы зьнявечанага за апошнія дзесяцігодзьдзі замчышча ўпершыню В.Ляўко, А.Мяцельскім і Ю.Каласоўскім вяліся шырокамаштабныя пошукі сьлядоў старой Дубровенскай фартэцыі. Стала вядома, што першыя ўмацаваньні ўзводзіліся тут яшчэ на мяжы XV-XVI ст. (якраз, калі пачыналіся зацятыя войны з Масквой). Паступова замак набываў больш грозны выгляд. Магчыма першапачаткова, як сьцьвярджае В.Ляўко, у яго цэнтры стаяла вялікая драўляная вежа, а па пэрымэтры разьмяшчаўся высокі тын, нечым нагадваючы сыстэму ўмацаваньняў зь вежамі тыпу «данжон».

На беразе ракі Расасінкі каля в. Вешкі, што на Дубровеншчыне, Каласоўскі капаў мясцовае гарадзішча часоў жалезнага веку. Трапіліся надзвычай рэдкія знаходкі кшталту бранзалетаў, скроневых колцаў, бурштынавых пацерак, падвесак, аналёгіі якім, на думку Ю.Каласоўскага, можна знайсьці ў старажытнасьцях магутнага славянскага саюзу антаў. Анты жылі на прасторах ад Карпат да Паўночнага Данца. Маючы добрую вайсковую арганізацыю, яны ў пачатку VI ст. разам з склавінамі вялі вайну супраць Візантыі. Каласоўскі не выключае, што насельнікі з гарадзішча Вешкі маглі ўдзельнічаць у паходах антаў.

**ВАЛОЖЫН.** На Валожыншчыне каля в. Кашчэлічы Аляксандар Мядзьведзеў працягваў раскопкі гарадзішча I-V ст. Раней у межах умацаваньняў знаходзілі кавальню зь вялікім каменем замест кавадла. Сёлета на месцы раскопак трапіліся рэшткі жалезаробчых майстэрняў, якія даюць уяўленьне пра кавальскі вытворчы комплекс эпохі жалеза.

**БЕРАСТАВІЦА.** Эдвард Зайкоўскі, не спыняючыся ў сваіх пошуках сьлядоў паганства, на гэты раз праводзіў раскопкі ў Верхаўлянах. Ён перакананы, што тут у XII ст. было капішча з брукаванай пляцоўкаю і ямай, дзе, мусіць, стаяў паганскі стод. Нават крамянёвая пласьцінка і жалезны нож у гэтым комплексе разглядаюцца ім як рэчы культавага прызначэньня.

**МЕНСК.** Ужо не адно пакаленьне археолягаў імкнецца разгадаць таямніцу гарадзішча на Менцы пад Менскам. Ці мог там першапачаткова ўзьнікнуць сярэднявечны Менск? Юры Заяц у гэтым годзе засяродзіў сваю ўвагу на раскопках селішча, якое разьмешчанае побач з гарадзішчам. Магчыма тут былі гарадзкія пасады, на месцы якіх знойдзеныя рэшткі чатырох жытлаў X-XII ст.

**ПЕТРЫКАЎ-ТУРАЎ.** Амэрыканскі прафэсар Уолд Трэмэр са сваімі студэнтамі кожны год прыяжджае з Пэнсыльваніі на Палесьсе. Тут, на Тураўшчыне, як нідзе ў іншым месцы, адчуваецца архаізм славянскай культуры. Некалькі гадоў запар Трэмэр працуе пад в. Сьнядзін у археалягічнай экспэдыцыі, якую ўзначальвае Валянцін Вяргей. Сьнядзін адрэзаны Прыпяцьцю і балотамі ад густа заселенага высокага правабярэжжа. Побыт і ўклад жыцьця тутэйшых жыхароў вылучаецца ўстойлівай традыцыйнасьцю, а прыпяцкія лугі і азёры захоўваюць першасную прыгажосьць і каларыт дамэліярацыйнага Палесься. У некранутыя тутэйшыя краявіды добра ўпісваюцца пагоркі з сьлядамі старажытных паселішчаў і пахаваньняў.

В.Вяргей дасьледуе ўнікальнае селішча VII ст. з рэшткамі жытлаў часоў знакамітай агульнаславянскай культуры Прага-Корчак, сьляды якой адшуканыя на вялікіх прасторах Эўропы: ад Дняпра да Эльбы і Дуная. Папрыпяцьце, верагодна, было ў тыя часы паўночна-ўсходняю ўскраінай славянскага сьвету. У археолягаў склаўся пэўны вобраз побыту старажытных славянаў, якія жылі звычайна ў паўзямлянкавых хацінах з каменнымі ці гліністымі печкамі ў кутку. Але чаму, напрыклад, пад Сьнядзінам славяне будавалі нетрадыцыйныя наземныя будынкі, — задае сабе пытаньне В.Вяргей. Сьнядзінскае селішча прынесла яшчэ адно важнае адкрыцьцё — рэшткі мэталюргічных печаў.

У.Трэмэр — няспынны вандроўнік і зацяты археоляг, які прымаў удзел у раскопках у Канадзе, Мэксыцы, Турцыі, Чэхаславаччыне, ЗША. Некалі яго выбралі з тысячаў прэтэндэнтаў у касьмічны палёт на «Чэленджэры». Карабель выбухнуў яшчэ на ўзьлёце. Воляю выпадку У.Трэмэр у той палёт ня трапіў. Апынуўшыся на Палесьсі, зачараваны тутэйшымі людзьмі і краявідамі, археалягічнымі багацьцямі, прафэсар пабачыў, што яму ў чарговы раз пашчасьціла.

У Сьнядзіне Алег Іоў паспрабаваў адшукаць месцазнаходжаньне летапіснага Сьмедзіна, які згадваецца ў Наўгародзкім летапісе сярод папрыпяцкіх гарадоў Тураўшчыны. Заклаўшы раскоп у двары вясковай школы, побач з старарэччам Прыпяці, А.Іоў адкрыў сьляды паселішча, матэрыяльная культура якога нагадвае гарадзкую. Такую колькасьць шкляных бранзалетаў не ва ўсялякім горадзе знойдзеш! Можа тут і стаяў сярэднявечны Сьмедзін? Дарэчы ў мясцовым вымаўленьні вельмі часта назва вёскі так і гучыць: «Сьмедзін».

**РАКАЎ.** Валера Шаблюк у мястэчку Ракаў адшукаў сьляды паселішча XV ст. А недалёка ад сучаснага ракаўскага касьцёла яму ў раскопе трапіліся рэшткі былога дамініканскага кляштара.

**КАПЫЛЬ.** Сёлета ўпершыню пачаліся раскопкі на Капыльскім замчышчы. Самае раньняе летапіснае паведамленьне пра Капыль адносіцца да 1274 г. Археалягічныя дасьледаваньні Лявона Калядзінскага дазваляюць датаваць зьяўленьне горада на 150-200 гадоў раней.

**НАВАГРАДАК.** Адзін з найстаражытнейшых мураваных замкаў Беларусі Наваградзкі па-ранейшаму прываблівае ўвагу навукоўцаў. Валянцін Собаль, заглыбіўшы раскоп каля часткова ацалелых муроў, знайшоў рэшткі вежы другой паловы XIII ст. Яна ўзводзілася, як сьведчаць добра датаваныя знаходкі, у час пасьля княжаньня Міндоўга. Навагрудак тады перажываў ня лепшыя свае часы, няспынна адбіваючы напады захопнікаў.

Як закончыліся раскопкі для дасьледчыкаў каменнага і бронзавага вякоў?

Вадзім Лакіза летась каля в. Пархуты на беразе Шчары знайшоў сьляды пахаваньня канца III тысячагодзьдзя да н.э. Раскопкі пад Пархутамі працягваліся й сёлета. На гэты раз тут удалося засьведчыць культурныя пласты паселішча эпох каменя і бронзы.

Ваколіцы мястэчка Моталь ды вёскі Тышкавічы пад Янавам-Палескім сталі месцам шматгадовых археалягічных дасьледаваньняў Алены Калечыц. Тут, недалёка ад Ясельды і абапал Мотальскага возера размяшчалася колькі дзясяткаў паселішчаў каменнага і бронзавага вякоў. За Ясельдаю каля Гнеўчыцаў бульдозэрам бурыліся сьляды ўнікальнага старажытнага паселішча, на месцы якога прыйшлося падбіраць раструшчаны посуд і шматлікія рэчы. Аказалася, што ў пластах помніка канцэнтруюцца рэшткі надзвычай рэдкіх для Заходняга Палесься культур, сфармаваных ў III-II тыс. да н.э. на прасторах Валыні, Сярэдняй Эўропы.

Уладзімер Ксяндзоў капаў на Проні пад в. Робцы пасельшча, на якім захаваліся крамянёвыя вырабы так званай грэнскай культуры часоў раньняга мэзаліту — VIII тыс. да н. э.

Я працягваў шукаць пахаваньні эпохі бронзы. Сапраўдная «даліна цароў» выяўленая каля Рагачова на прасторах шырокай дняпроўскай поймы. Разам з Ігарам Язэпенкам колькі гадоў запар кілямэтар за кілямэтрам мы аглядаем усе прыдатныя пад магільнікі і паселішчы пойменныя ўзвышшы, мяркуючы стварыць мікрарэгіяльную карту помнікаў і змадэляваць працэс асваеньня гэтай тэрыторыі ў эпоху каменя і бронзы. Яшчэ ў 60-ыя гады тут капаліся ўнікальныя курганныя пахаваньні канца III — пачатку II тыс. да н.э. Асобныя магільныя комплексы вылучаліся багацьцем зброі, посуду, наборам упрыгожваньняў, у тым ліку прынесеных зь іншых куткоў Эўропы. Апошнімі гадамі мы адкрылі цэлы шэраг іншых нэкропаляў і паселішчаў эпохі бронзы. Дваццаць унікальных пахаваньняў знойдзеныя і скрупулёзна вывучаныя на беразе возера Прорва. Адну з такіх магіл на падставе радыёкарбонных вызначэньняў удалося прадатаваць 2600-мі гадамі да н.э.

Гэтая панарама сёлетніх археалягічных пошукаў, безумоўна, не прэтэндуе на ўсеабдымнасьць. Гэта толькі найбольш прыкметныя дэталі мінулага лета. Каштоўнасьць такой інфармацыі заключаецца ў яе гуманістычнасьці. Мы больш даведваемся пра свае паселішчы, сваю краіну і пра сябе.

**Мікола Крывальцэвіч**

# Kalandar
KALANDAR

## 25 listapada

U hety dzień naradziŭsia: hišpanski dramaturh Lope de Vega (1562-1635), stvaralnik hišpanskaha nacyjanalnaha teatru.

## 26 listapada

Naradzilisia: biełaruski movaznaŭca Janka Stankievič (1891), biełaruski kampazytar Jury Siemianiaka (1925) i biełaruski piśmieńnik Uładzimier Karatkievič (1930).

## 27 listapada

Naradzilisia Andres Celsij (1701-44), švedzki astranom, jaki vynajšaŭ i nazvaŭ svaim imiem termametryčnuju škału; Chaim Weizmann (1874-1952), pieršy prezydent Izraelu.

## 28 listapada

U hety dzień... u 1893 h. žančyny ŭ Novaj Zelandyi pieršyja ŭ śviecie ŭpieršyniu pajšli hałasavać na ŭsieahulnych vabarach.

Naradzilisia: William Blake (1757-1827), anhielski paet i mastak; italjanski piśmieńnik Alberto Moravia (1907-90).

## 29 listapada

U hety dzień... u 1939 h. savieckija ŭłady rasstralali biełaruskaha litaratara, vučonaha i palityka Branisłava Taraškieviča; u 1949 h. u savieckim GULAGu pamior biełaruski aśvietnik Adam Stankievič.

## 30 listapada

U hety dzień... u 1808 h. u dzień św. Andreja, patrona Šatlandyi, u Glasgow adbyŭsia pieršy ŭ śviecie mižnarodny futbolny mač. Sustreča šatlandcaŭ z anhielcami skončyłasia nulavoj ničyjoj.

Naradziŭsia: Jonathan Swift (1667-1745), irlandzki piśmieńnik, aŭtar słavutaj satyry «Padarožža Hulivera», za jakuju atrymaŭ 200 funtaŭ (adziny hanarar za litaraturnuju pracu, jaki atrymaŭ za ŭsio svajo žyćcio); Andrej Śniadecki (1768-1838), chimik, bijolah i filozaf, prafesar Vilenskaj Medyka-Chirurhičnaj Akademii; Samuel Langhorne Clemens albo Mark Twain (1835-1910), amerykanski piśmieńnik, stvaralnik vobrazaŭ Toma Sawyera i Huckelberry Finna.

## 1 śniežnia

U hety dzień... naradziłasia madame Tussaud (1761-1850), skulptarka švejcarskaha pachodžańnia, jakaja stvaryła viadomy na ŭvieś śviet muzej vaskovych fihuraŭ u Londanie.

*Апавяданьне*

# ЧАКАЙ...

Яна падняла вочы, агонь зялёны шугануў зь іх загадкавай глыбіні, і Глеб спачатку нават ня мог зразумець па яе твары, што няўлоўна зьмяніўся, узрадавалася яна ці спалохалася.

— Што так доўга? — спытаў ён, падыходзячы.

— Вера Васілеўна прасіла скончыць разьлікі да заўтра, —зьзяньне яе вачэй з кожнай хвілінай ставала ўсё ярчэй і цяплей, і, сядаючы на краёчак суседняга стала, Глеб ужо бачыў: узрадавалася.

Амаль нічога Глеб ня ведаў пра гэтую дзяўчыну. Ня ведаў нават, як яе завуць. Ды ёй неяк і не пасавала ні адно зь вядомых яму іменаў. На заводзе ўсе называлі яе Мадэмуазэль; яна і сапраўды моцна паходзіла на тую францужанку, якую таксама ўсе так называлі паўвека назад. У сьвеце вытворчай дысцыпліны і стэрыльнасьці яна выглядала нязвычна. Зграбная пастава, адкрыты твар, чыстыя фарбы скуры, бліскучыя вочы, ядвабныя блюзкі, тонкі пах сьледам па калідоры... Пра яе плявузгалі жанчыны, пра яе гаварылі мужчыны, а сама яна, стрыманая і маўклівая, была з ўсімі роўная ды халаднаватая. Ільдзінка ўваччу раставала адно тады, калі яна глядзела на Глеба. Але Глеб ваяваў зь перасорціцай ды дэфэктамі вакуумнага напыленьня, і правёўшы Мадэмуазэль доўгім позіркам ды пацёршы лоб — пра што гэта трэба ўспомніць? — зноў заглыбляўся ў паперы. А яна ў які раз думала, што, відаць, талай вадзе ня суджана змыць сумёты таго, што падаецца яму важным, а, значыць, ёй, бездакорнай мадэмуазэль інжынэру, зноў і зноў глядзець у змрок, спрабуючы забыцца на тое, што здаецца важным ёй...

— А няважнае ў вас тут, аднак, асьвятленьне, — заўважыў Глеб.

— Але, — падхапіла яна, — і, галоўнае, бжучаць гэтыя лямпы так мярзотна, ад гэтага чамусьці прыгадваюцца прусакі, як яны паўзуць са шчылін. Бр-р,— яна перасмыкнула плячыма.

— Падсьвядомасьць, страшная рэч, — расьсьмяўся Глеб, з задавальненьнем адзначыўшы, як празьзяў у адказ яе твар. —Пэўна, успамінаецца Рэмарк, тое месца, дзе... Памятаеце?

— Памятаю, але. Я наагул заўважала, асацыяцыі рэдка бываюць рэальнымі. Ну, можа толькі ад пахаў. А сытуацыі, словы часьцей асацыююцца зь літаратурнымі калізіямі...

— Гэта ад таго, можа, што ў кнігах заўжды адбываюцца значныя падзеі. Ці, лепш сказаць, шматзначныя. А значнасьць ці шматзначнасьць рэальнага жыцьця так ці інакш застанецца для нас сумнеўнай.

Яна энэргічна заківала, і Глеб бачыў, што яна разумее ня толькі тое, што ён сказаў, але й тое, што хацеў сказаць, і што яна прыймае і падтрымвае гэта. Футарал прытворства — адзеньне на кожны дзень — зь ёй быў недарэчны. Глеб адчуваў дзіўную сувязь, што мацнела між імі: у іх размове словы сталіся толькі неабавязковым атачэньнем чагосьці нашмат больш істотнага. Яны размаўлялі, нібыта яблыкі зрывалі з галін, не даючы ім упасьці ды разьбіцца аб цьвёрдую зямлю. Гэта было цудоўна і страшна. Але Глебу раптам зрабілася страшна: ён пабачыў, як хвіліны напаўняюцца сэнсам, набрыньваюць ім, бы крывёй. Яму міжволі захацелася адмахнуцца, пайсьці адсюль, забыцца пра ўсё: пра неакрэсьленае прыцягненьне, пра доўгія позіркі ўсьлед, пра сёньняшнюю размову, пра тое, што казалася бяз словаў, паміж словамі, над словамі.

Дзяўчына з усьмешкай штосьці тлумачыла, але ён чуў толькі трымценьне сваёй крыві, што сачылася з драбнюсенькіх пораў. Крыві, якой набрыняў час. Ён ня мог адвесьці вачэй ад яе рук: яны, што птушкі на галінах, трошкі падрыгвалі на лісьце ватмана.

— Ведаеш што, пойдзем да мяне,— глуха, нечакана для сябе самога сказаў ён.

Дзяўчына ўскінула павекі, але, як падалося Глебу, нікольkі не зьдзівілася і адразу ўстала.

У калідоры ён ўзяў яе за руку. Яна трошкі павярнула далонь і таксама сьціснула яго руку тонкімі доўгімі пальцамі. Ці пяшчота пакідае на вуснах саланаваты прысмак? А жаданьне?

Смуга ночы, цяпло мяккай скуры, словы, такія шчырыя, што падаюцца пацеркамі, што пасыпаліся з разарванай ніткі... Калі яна, паклаўшы галаву яму на плячо, спала, ён гладзіў яе валасы, глядзеў у шэрасьць вакна і думаў: «Вось як, значыць, бываюць шчасьлівымі...»

У прыймовым пакоі затраскацеў тэлефон: дырэктар меў мілую звычку на першым золку запытацца, ці добра спаў-пачываў флагман айчыннай мікраэлектронікі. Прачнуўшыся, яна мякка пацягнулася, па-дзіцячы працерла вочы кулачкамі і з усьмешкай падштурхнула Глеба: ну што ж ты, ідзі... Хуценька супакоіўшы Татачку, ён вярнуўся. У пакоі нікога не было. Адрухова Глеб ірвануўся да дзьвярэй, але спыніўся і, вярнуўшыся да канапы, сеў. Зрэшты, толькі адна ноч. Гэта слабая процівага, калі на другой шалі —трыццаць гадоў жыцьця.

Аддаючы вахцёрцы пропуск, яна ўжо ведала, што больш ня вернецца сюды, не дакранецца больш да плястыкавай карткі, што мела прэтэнзію стаць сутнасьцю і знакам жанчыны. Падняўшыся да сябе ў пакой, яна нават засьмяялася ад радасьці. Не! Больш гэтага ня будзе. Сьцёрла макіяж, лак з пазногцяў, гладка прычасалася — і амаль што не пазнала сябе ў люстэрку. «Мадэмуазэль, — падумала, пасьміхнуўшыся. — Ну, досыць, мадэмуазэль Пелагея. Дамоў.»

Любіць маці — гэта проста, калі маці проста любіць цябе, і яе зялёныя вочы блішчаць, але пытаньняў ты ня чуеш. Кінуўшы ў кут вялізную торбу, што бачыла Варшаву ды Стамбул, Поля пераапранулася ды пайшла ў поле, дзе ракатала пяцітонка і куды маці наказала бегчы як хутчэй. Усе дзесяць кабет-суседак, дзесяць гаспадыняў, завіхаліся тут. Каб прыняць жыцьцё і перастаць думаць пра яго, дастаткова пачуць, як падаюць у кодаб грузавіка — тук-тук-тук, бах, тум-тук — гэтыя вялізныя буракі... Пальцы, гадзіну таму дагледжаныя ды далікатныя, пакрыліся тонкай земляной скарынкай, пад пазногці забіліся чорныя пясчынкі. Малады шафёр, што кружляў, звужваючы кругі, вакол машыны, нарэшце рашыўся і, прымасьціўшыся ля Полі, узяўся дапамагаць жанчынам. Гэта трохі сапсавала ёй настрой, бо сымпатычны юнак, што макам пачырванеў ад шматлікіх жартаў, нагадаў пра яго, а Полі не хацелася ўспамінаць. Не хацелася думаць, не хацелася губляць пачуцьцё поўнага жыцьця.

Калі грузавік пратрэсься па полі і вывярнуў на грунтоўку, Поля падсьцяліла куфайку і лягла на зямлю воддаль ад суседак. Восеньскія промні і вецер былі такімі пяшчотнымі — не, не як яго рукі, а як... так, няхай, як яго рукі. Няхай. Яна ня будзе з-за гэтага смуткаваць. Няхай. Яна не пашкадуе пра тое, што было — дзякуючы таму, што было, яна тут, і ёй добра, і туга пайшла ад яе. І яна не шкадуе, што ўсё прайшло — таму што ня хоча больш фальшу. У яго свой шлях, у яе — свой, і няхай усё будзе так, як будзе.

З заплюшчанымі вачыма яна пацягнулася, паклала далоні пад галаву, і струмені паветра адарвалі яе ад зямлі і плаўна панеслі ўгору. Засталіся ўнізе верхавіны дубоў на ўскрайку поля, яна бачыла сьветлую палоску грунтоўкі, шашу, на якую вырульваў грузавік; насустрач яму йшлі цёмныя «жыгулі». Поля лунала ўсё вышэй: збоку зьявіліся дахі дамоў вёсачкі, нязвычна выглядаў зьверху лес, паблісквала рака... Сюды даносіліся толькі пахі печанай бульбы — дзеці распалілі вогнішча на суседнім полі — ды сырой халоднай зямлі. Магутныя паветраныя патокі выяўлялі шлях, па якім спускаюцца на зямлю душы, што хочуць наведаць былы дом свой.

— А гэта хто ж прыехаў? Нешта не пазнаю...

Пелагея расплюшчыла вочы, хутка села. Бразнуўшы дзьверкай цёмных «жыгулёў», да яе йшоў Глеб — у куфайцы, сьмешнай круглай шапачцы і кірзавых чоботах...

— Я падумаў, можа, спатрэблюся: прынясьці-аднясьці, пагрузіць-разгрузіць... Карацей, ці мала на што на палявых работах спатрэбіцца грубая мужчынская сіла? — сказаў ён, пасьміхаючыся вачыма.

Яна паднялася і пайшла яму насустрач.

Два крылатых хлопцы, што назіралі за імі зь лістоты найбліжшага дуба, пераглянуліся.

— Бадай што, цяпер мы можам сабе дазволіць перакуліць па чарцы, — сказаў адзін.

— Бадай, — пагадзіўся другі. — Аднак чакай, чакай, — ён яшчэ раз рассунуў лісьце і ўважліва пагледзеў на поле. — Лепш усё ж такі вярнуцца як мага хутчэй. За гэнымі людзьмі патрэбна пільнаваць і пільнаваць.

І яны зьняліся з галіны.

# СЛОЎНІК АСНОЎНЫХ ТЭРМІНАЎ

дуць зьяўляцца на рынку толькі зрэдку.

**Камэрцыйнае мастацтва.** Усё тое, што робіць мастак з калькулятарам у руках. Камэрцыйнае мастацтва звычайна дастаўляецца кліенту ў скрыні з брунатнага кардону і з наклеенай на яе квітанцыяй для аплаты.

**Прыгожае мастацтва.** У камэрцыйным мастацтве Вы спачатку высьвятляеце, колькі Вам за гэта заплацяць. А ў прыгожым мастацтве ўсё адбываецца наадварот.

**«Гэта не мастацтва, а ілюстрацыя».** Гэтым займаецца амаль кожны зь сёньняшніх мастакоў. Рок'н-рольныя сьпевакі – мастакі. Гэтаксама як і кінарэжысэры, дэкаратары, грымэры, эстрадныя артысты і выканаўцы рэпу. Кіназоркі таксама мастакі. Мадона зьяўляецца мастачкай, бо выяўляе сваю ўласную сэксуальнасьць. Снуп Догі Дог таксама мастак, бо выяўляе сэксуальнасьць іншых. Ахвяры, што выказваюць свой боль – таксама мастакі. Таксама й зэкі ў турмах, што самавыражаюцца, размалёўваючы сябе татуіроўкамі. Нават пакупнікі ў крамах – таксама мастакі, бо самавыражаюцца праз свой выбар тавараў. Адзіныя людзі ў Амэрыцы, хто, здаецца, не мастакі – гэта ілюстратары.

**Любі мяне, любі маё мастацта.** Норман Рокуэл любіў гаварыць, што калі карціна атрымліваецца кепска, пасадзі на яе сабаку. Калі яна атрымліваецца вельмі кепска, зьвяжы сабаку лапы. Гэта асноўны прынцып мастацтва ахвяраў.

**Мастацтва татуіроўкі.** Мне ніколі не падабаліся татуіроўкі, хоць я лічу, што яны паляпшаюць некаторых людзей – асабліва тых, што таўкуцца вакол татуіровачных кабінэтаў.

**Кіч.** На працягу майго жыцьця кіч эвалюцыянаваў ад цынічнай сэнтымэнтальнасьці календароў Максфільда Пэрыша да сэнтымэнтальнага цынізму фільмаў пра Бэтмэна.

**Стыль.** Стыль – гэта найбольш каштоўная вартасьць сучаснага мастацтва. Напэўна з-за гэтага мы чуем столькі паведамленьняў пра страту ці крадзеж стылю.

**Традыцыяналізм.** Усё яшчэ існуе пэўная колькасьць традыцыяналістаў, якія працуюць, у асноўным, у школах мастацтваў, і працягваюць маляваць як прадстаўнікі школы рэалізму часоў першай сусьветнай вайны. На працягу многіх гадоў гэта задавальняла авангардыстаў, якія трымаюць гэтых амішаў (прадстаўнікі рэлігійнай абшчыны ў ЗША, што не прызнаюць цывілізацыю і трымаюцца стылю жыцьця 17 ст. – У.Б.) ад мастацтва ў якасьці ўзору істэблішмэнту.

**Авангард.** Болей за 100 гадоў таму нейкія прадстаўнікі францускай багемы вырашылі, што мэта мастацтва ў тым, каб шакаваць сярэднія клясы. Магчыма тады гэта і была вялікая ідэя. Але сёньня прадстаўнікі сярэдняй клясы не зьвяртаюць на гэта ўвагі. Яны загараюць сабе на пляжах Маямі ды абменьваюцца ўражаньнямі ад перапрананьня ў жаночую вопратку ці ад сэксу з выхавацелькай, што прыходзіць даглядаць дзяцей. Ультрасучасныя мастакі мусяць у адчаі назіраць за ўсім гэтым і скардзіцца пра стан амэрыканскай культуры, і, разам з тым, патрабаваць усё больш і больш грантаў для свайго наймоўшага мастацтва. У будучыні апісаньне гэткага відовішча (калі сярэдняя кляса шакуе авангардыстаў) у падручніках мастацтва будзе, магчыма, называцца тэрмінам «постмадэрнізм».

**«Часам ты мусіш парушаць правілы».** Сярод таго, чаго не хапае людзям для захапленьня сучасным мастацтвам, гэта тое, што ягоная філязофія можа быць выражаная ў рэкляме гамбургера ад Burger King.

**Рамесьніцтва.** Традыцыйны рамесьнік працаваў, трымаючыся пэўных традыцыяў. Час ад часу гэтыя традыцыі пераглядаліся геніямі. Аднак у сучасным мастацтве кожны мусіць увесь час пераглядаць традыцыі. Гэта магло б прывесьці нас яшчэ да адной эпохі Рэнэсансу, пры ўмове, калі б у нашым сьвеце адбыўся выбух геніяў. Але паколькі фэномэн гіпэртрафаванага ўласнага «Я» больш распаўсюджаны за геніяльнасьць, то мастацтва постмадэрнізму больш вызначаецца нарцысызмам, чымся гераізмам.

**Тэорыя мастацтваў.** Тыповы сучасны мастак стварае маленькую працу, загорнутую ў вялікую тэорыю. Некаторыя замест самога твора мастацтва выстаўляюць на агляд адну надрукаваную на паперы тэорыю. Мне гэта падаецца разумнай эканоміяй стылю. Калі мэтай мастацтва ёсьць перагляд мастацтва, то словы граюць тут асноўную ролю. Навошта завальваць сьвет лішнімі ўзорамі.

**Самавыражэньне.** Лом, якім мастакі намагаюцца адчыніць скрыню Пандоры самазадавальненьня. Трыццаць гадоў таму кожны багемны мастак у сваіх блакітных марах бачыў, як ён, апрануты ў блакітныя джынсы і з красоўкамі на нагах, выходзіць зь лімузіна. Сёньня такую мару мае, напэўна, палова ўсяго насельніцтва краіны.

**Цуд непадражальнасьці.** Вера ў грамадзкую карысьць ад таго, калі мы ўсе будзем самавыражацца непадражальным чынам. Чароўны ідэал, але ён ня ўлічвае відавочнага. У сьвеце і так хапае прыродных блазнаў ды ідыётаў. І заахвочваньне іх да самавыражэньня нікому не прынясе карысьці, асабліва грамадзтву.

**Інстынкт.** Калісьці ў дагістарычных джунглях тыя жывёлы, што давяралі іншым зьвярам, зьядаліся імі. Выжылі і расплодніліся толькі тыя, што інстынктыўна ўсіх баяліся і хавалі галовы. Гэта тлумачыць, чаму многія людзі, што на ўзор мастакоў давяраюць сваім інстынктам, паводзяць сябе як кракадзілы.

**Мастацтва абуджэньня сьвядомасьці.** Унівэрсальнае апраўданьне мастака, які, бы пэрліну, кідае сябе сьвіньням дэмакратыі. Кожны раз, калі я ведаю, што мастак спрабуе абудзіць маю сьвядомасьць, я прыгадваю Джэйн Фонду, Сісі Спасэк, і Джэсыку Лэндж, што распавядаюць у Кангрэсе пра рэаліі жыцьця на фэрме.

**Юнгназаўсёды.** Постмадэрністы вераць, што праўда – гэта міт, а міт – гэта праўда. Гэткае ўраўнаваньне сваімі каранямі сягае ў папулярную псыхалёгію. Тыя ж самыя людзі таксама вераць, што эмоцыі – гэта форма рэальнасьці. Для такога стану розуму існавала і іншае азначэньне. Гэта звычайны псыхоз.

**Мульцікультуралізм.** Я ніколі ня мог уцямліць, чаму мастакі, што і так моцна злоўжываюць кліша сваёй уласнай культуры, нагэтулькі ахвотна кідаюцца і ў абдымкі кліша культураў, пра якія яны нічога ня ведаюць.

**У чаканьні Ван Гога.** У сьвеце, дзе вырасла большасць з нас, папулярнае мастацтва атрымала ў спадчыну і распаўсюдзіла ўсе формы мастацтва, што існавалі да яго. Усё – ад прымітыўнага мастацтва родаплямённых народаў да прыгожага мастацтва арыстакратычнага грамадзтва – было ўкінутае ў бэтонамяшалку сучаснай культуры. Тут перамяшаліся супастаўленьні славутасьці і ананімнасьці, галечы і раптоўнага багацьця. Тон кірункам і тэндэнцыям задае масавы попыт. Праўда ў тым, што мы яшчэ пасапраўднаму ня выявілі, як мастак можа пасьпяхова працаваць у сучасным грамадзтве. Усе мы знаходзімся на стадыі экспэрымэнту.



*The Atlantic Monthly, Internet*

ПАДРЫХТАВАЎ УЛАДЗІМЕР БАРАНІЧ

# Крывіцкая Мэкка

## *Вынікі конкурсу*

Самае вялікае ўражаньне пасьля знаёмства з адказамі на «юбілейны» конкурс, які быў прысьвечаны Вільні, радзіме «Нашае Нівы», — гэта эрудыцыя нашых шматлікіх карэспандэнтаў. Большасьць з тых, хто даслаў нам свае адказы, сапраўды вельмі любяць спрадвечную сталіцу і вельмі добра яе ведаюць. Нягледзячы на ўсе межы, беларусы зь Вялейкі, з Гомеля, з Магілёва, з Асіповічаў, з Наваполацку, з усіх куткоў Беларусі мараць пра Вільню. І добра ведаюць, чаму гэтая сьветлая мара будзе жыць з пакаленьня ў пакаленьне.

**1. Вострая Брама.** «Толькі ў сэрцы трывожным пачую...» Радкі М.Багдановіча прыгадаў ледзьве ня кожны наш карэспандэнт. Традыцыя часта аказваецца нашмат больш трывалаю, чым нам гэта можа падавацца ў будзёным жыцьці. Пакуль людзі будуць чытаць па-беларуску, датуль яны будуць памятаць Багдановіча. Пакуль у памяці будзе жыць Багдановіч, у сэрцах будзе жыць і Вільня.

«Вострая Брама была змураваная разам з гарадзкімі абарончымі мурамі ў першай чвэрці XVI ст. на дарозе, што ідзе ў бок Меднікаў. Таму раней яшчэ яна звалася Медніцкай,» — піша Міхась Якаўлеў. Варта толькі дадаць, што шляхі з брамы разыходзяцца на Полацак і на Ліду. «Сваю ж сёньняшнюю назву Вострая Брама атрымала ад вуліцы, што на ёй замыкалася. А ў 1503-04 г. брама звалася Крэўскай. Упершыню назва «Вострая Брама» сустракаецца ў дакумэнтах за 1594 год,» — так падрабязна распавядае Сяргей Грынцэвіч і дадае, што будоўляю брамы кіраваў дойлід Ян Сколды.



У 1671 годзе законьнікі кармэліты збудавалі над брамаю капліцу, куды быў зьмешчаны цудадзейны абраз «Маці Божае Вастрабрамскае». Пра гэта таксама напісалі многія. А Грынцэвіч прыводзіць і дзьве вэрсіі зьяўленьня абраза. Паводле адной, яна была прывезеная самім князем Альгердам у 1363 годзе з Корсуні, пасьля наезду на Крым. Паводле другой, прататыпам «Маці Божае» была Барбара Радзівіл, але гэта, вядома, легенда. А Віктар Мухін нагадаў Міцкевіча:

*О ты, заступніца прачыстая над намі,*
*Чый цудатворны лік у Чанстахове ў храме,*
*І ў Вострай Браме сьвеціцца*
*пры набажэнстве,*
*І ў Навагрудку замкавым! Як мне*
*ў маленстве*
*Жыцьцё вярнула ты, зьявіўшы цуд нябесны...*

Многія не забыліся дапісаць нам, што звонку на Вострай Браме скрыдлатыя грыфоны ўжо сотні гадоў трымаюць «Пагоню», якую і апеў Багдановіч.

Бадай, самым арыгінальным стаў адказ Іны Гардзіевіч; «Гэта Вострая Брама. Яе ведаюць усе».

**2. Двор у базыльянскіх мурах.** «Самае цяжкое пытаньне», як прызнаецца Сяргей Грынцэвіч. Але многія на яго ўсё ж адказалі. Самым лепшым мне падаўся адказ Міхася Якаўлева: «Тут, у будынках былога кляштару базыльянаў, куды можна патрапіць праз пекную браму работы Гляўбіца (1761), знаходзяцца будынкі, у якіх месьцілася першая Беларуская гімназія — «alma mater» слаўных дзеячоў нашага краю, бібліятэка і скарбы Беларускага музэю імя Івана Луцкевіча (1921-43). Тутака ж з ініцыятывы Адама Станкевіча быў адчынены прытулак для дзетак-сіротаў. У будынку, што на здымку, жылі Максім Гарэцкі (тут ён напісаў першую «Гісторыю беларускай літаратуры»), Аркадзь Смоліч (ён тут склаў першую «Геаграфію Беларусі»), а таксама Рыгор Шырма.»



Шмат хто з чытачоў прыгадвае, што кляштар базыльянаў быў зачынены за часамі расейскае акупацыі і тут расейцы зрабілі турму. У гэтай самай турме ў 1823-24 быў зьняволены Адам Міцкевіч — у так званай «цэлі Конрада».

Таксама некаторыя нашыя карэспандэнты напісалі нам пра царкву Сьвятое Тройцы, якую фундаваў славуты вайскаводзец князь Канстанцін Астроскі. Гэтая царква была пастаўленая ў запаветнай дуброве ў гонар вялікае перамогі пад Воршаю 8 верасьня 1514 года, калі нашае войска нагалоў разьбіла войскі маскоўскіх захопнікаў. Сёньня царква належыць Украінскай Каталіцкай царкве, але кожную нядзелю тут адбываецца Сьвятая імша па-беларуску, якую правіць айцец Іван Даўкшыс.

**3. Вуліца Вастрабрамская.** «Гэтыя два дамы знаходзяцца недалёка ад Вострай Брамы. Раней вуліца насіла імя М.Горкага, цяпер ёй вернутая яе сапраўднае імя. Справа ад будынку з калёнамі адрэстаўраваны гатычны дом XV-XVI ст., у ягоных скляпеньнях цяпер утульная кавярня». Так напісала нам Іна Гардзіевіч. Добра, што нагадалі пра кавярню, яна сапраўды файная, аднак гэтыя дамы слаўныя ня толькі гэтым. Дом, што справа — былы будынак Беларускага інстытуту гаспадаркі і культуры, які месьціўся тут з 1926 году, а зьлева — рог будынку фільгармоніі, адразу за якім — будынак былой кнігарні Беларускага выдавецкага таварыства (Вастрабрамская, 1, рог з вуліцай Гетманскай). Пра гэтыя беларускія адрасы, і пра іншыя, што ёсьць на Вастрабрамскай, напісалі нам



М.Якаўлеў, С.Грынцэвіч, А.Селязьнёў, С.Мацкевіч, Н.Пятроўская, ды іншыя. А Коржыч з Гомеля дадаў, што гэта здымак Алеся Крыштаповіча, але памліўся з адказам.

**4. Касьцёл Сьвятога Юрыя.** Гэтая бажніца была закладзеная князем Мікалаем Радзівілам, ваяводам віленскім, у 1506 годзе, у гонар перамогі над туркамі і татарамі пад Клецкам. Так ужо сплецены віленскі лёс з усім лёсам Беларусі, што часам жартуючы, можна было б называць гэтае места мэмарыялам беларускае вайсковае славы.

Значна пазьней, у 1755 годзе гатычны касьцёл быў перабудаваны і набыў шыкоўны ракайльны ўбор, хоць злыя языкі называлі яго пасьля рэканструкцыі «банбаньеркай». У самім касьцёле захаваліся старасьвецкія росьпісы з выявамі Жыгімонта



III, Мікалая Радзівіла, ягонай жонкі Барбары, Юрыя Радзівіла. Пра гісторыю касьцёла нам таксама напісалі амаль усе ўдзельнікі конкурсу.

Касьцёл атрымаў сваю назву ад цудадзейнага абраза Сьвятога Юрыя, магчыма праваслаўнага, які ў ім зьберагаўся. Гэты абраз і дагэтуль шануецца ўсімі жыхарамі краю, што жыве пад «Пагоняй». А ў гонар бажніцы і абраза, сваю назву атрымала і вуліца — Сьвята-Юраўская. Пасьля расейцы перахрысьцілі яе ў Георгіеўскі праспэкт, пасьля была вернутая старая назва, пасьля палякі назвалі праспэкт у гонар Міцкевіча, з 1940 году літоўцы назвалі яго імем Гедыміна, з 1944 ён стаў Сталінскім, пасьля Леніна, а цяпер — ізноў Гедыміна.

**5. Касьцёл Сьвятога Міхала з кляштарам бэрнардынак.** Гэта зальнага тыпу маньерыстычная бажніца, у стылі якой зьнітаваныя і позьняя готыка, і рэнэсанс, і раньняе барока. І ня дзіва, бо яе будаўніцтва расьцягнулася з 1594 да 1625 году, пра што сьведчыць надпіс на галоўным фасадзе. Касьцёл і кляштар для сёстраў бэрнардынак былі фундаваныя канцлерам вялікім літоўскім, вялікім гетманам ды віленскім ваяводаю князем Львом Сапегам, адным з аўтараў «Статуту». Тут Сапега і быў пахаваны, а разам зь ім — дзьве ягоныя



жонкі, а пасьля і сыны. Іхнія труны, што былі ў крыпце пад галоўным аўтаром, былі разрабаваныя расейцамі і выкінутыя навонкі падчас вайны ў 1655 годзе.

У часе апошняе вайны ў касьцёле правілася літургія па-беларуску, пробашчам быў а. Адам Станкевіч, які ў часе адступленьня немцаў, перахоўваў ад іх экспанаты Беларускага музэю імя Івана Луцкевіча ў касьцельных мурах.

Па вайне расейцы ізноў разрабавалі сьвятыню, зьнішчылі старасьвецкі арган XVII ст. Пасьля літоўцы тут стварылі музэй архітэктуры. Сёньня кляштар вернуты бэрнардынкам.

**6. Жылы дом. Пяліма, 5.** Раней гэтая вуліца звалася Завальнай, тут у гэтым доме (Завальная, 7), на рагу з Малой Пагулянкай (сёньня вуліца Кастуся Каліноўскага) у 1911-13 гадах была рэдакцыя «Нашай Нівы». Сюды рэдакцыя пераехала зь Віленскай, 20. «У гэты час на Завальнай, 20 месьцілася Беларуская кнігарня, што пераехала сюды з Вастрабрамскай, 1. Тады пры рэдакцыі «Нашай Нівы» тут знаходзілася частка калекцыі Івана Луцкевіча. Дзьве начы тут начаваў Максім Багдановіч, калі, едучы ў Ракуцёўшчыну, першы і апошні раз наведаў Вільню і Беларусь. Імёны тых, з кім зьвязаны гэты дамок, які пазьней падрос на адзін паверх, склалі б гонар любой эўрапейскай нацыі, але яны злучаныя менавіта з нашай Айчынаю. Уласаў, Купала, Багдановіч, Колас, Гарэцкі, Бядуля, Цётка, Буйла, Драздовіч...», — так разважае Міхась Якаўлеў.

Тут жыў разам з жонкай, пазьней вядомай літоўскай пісьменьніцай, Лазьдзіну Пяледай (Ластоўскай), Вацлаў Ластоўскі. У 1916-17 гадах, калі Вільня была акупаваная немцамі, Ластоўскі тут выдаваў газэту «Гоман». Пасьля ад'езду зь Вільні ў Літву, ён выдаў у Коўне «Гісторыю беларускае (крыўскае) кнігі» — манумэнт тысячагадоваму беларускаму пісьменству.

У міжваенны час тут месьцілася рэдакцыя беларускага сатырычнага часопіса «Маланка».



Большасьць чытачоў беспамылкова назвалі і стары, і новы адрасы гэтага будынку, распавялі шмат падрабязнасьцяў зь біяграфіяў людзей, якія былі зьвязаныя з гэтай кропкай неахопнае віленскае беларушчыны.

«Вось і ўсё пра Вільню, нашую вечную сталіцу, сьвятое места для кожнага беларуса. Зразумела, што да ўсіх адрасоў хочацца дадаць — «былое». Але маркотна,» — так скончыў свой ліст пераможца гэтага конкурсу Міхась Якаўлеў зь Менску. Але, як на маю думку, для маркоты няма падставаў, пра што яскрава сьведчаць тыя шматлікія лісты, што дайшлі да нас. Вільня з намі... А пра тое, як зьберагаецца ў Вільні беларушчына сёньня, мы пісалі і будзем пісаць надалей.

Дзякуй усім за віншаваньні! А мы віншуем ўсіх Вас зь дзевяностымі ўгодкамі «Нашае Нівы».

**Сяргей Харэўскі**

### Новы конкурс

# Краіна замкаў

Ініцыятарам новага конкурсу «Нашай Нівы» стаў Клюб грамадзянаў Вялікага Княства. Гэты конкурс прысьвечаны замкам, якія ёсьць на ўсіх абшарах нашага старасьвецкага супольнага гаспадарства.

Фартэцыі, якія былі пастаўленыя Вялікімі князямі — самы яскравы ўзор агульнае спадчыны народаў ВКЛ. Бажніцы маглі належаць розным веравызнаньням, шляхецкія камяніцы — розным радам. Але вялікакняскія замкі нашага некалі неабсяжнага краю належалі ўсяму паспалітаму народу. За іхнімі мурамі ратаваліся ад варожых навалаў і люд просты, і шляхта, і сьвятарства любое веры. Іх фундавалі, будавалі, баранілі людзі ўсіх народаў, якія склалі магутную дзяржаву ад Балтыкі да Чарнамор'я. Гэта супольная спадчына беларусаў, літоўцаў, украінцаў, што зьнітаваная крывёю і цяжкімі высілкамі многіх пакаленьняў.

Клюб грамадзянаў Вялікага Княства мае і свой прыз — падарожжа ў Вільню, куды выправяцца пераможцы.

Пытаньні першыя. Які замак выяўлены на гэтым старым здымку? Які князь яго паставіў і зь якімі падзеямі ён зьвязаны?

**Сяргей Харэўскі**

1



© НАША НІВА Спасылка на "Нашу Ніву" абавязковая Наклад 5100 Нумар падпісаны ў друк $19^{55}$, 24/11/1996. Друкарня выдавецтва "Беларускі Дом друку". Менск, праспэкт Францішка Скарыны, 79. Замова № 7410 Кошт свабодны.